## Розгалас

### АЎТОБУС АДХІЛІЎСЯ — НАВІГАЦЫЯ ЗАЎВАЖЫЦЬ

**Сістэма аўтаматызаванага кіравання рухам аўтобусаў з выкарыстаннем магчымасцяў спадарожнікавай навігацыі працуе ўжо амаль у 50 гарадах краіны. Бартавое абсталяванне ўстаноўлена больш чым на 3,5 тысячы аўтобусаў.**

Укараненне аўтаматызаванай сістэмы кіравання з выкарыстаннем глабальнай навігацыі дазваляе павысіць, у прыватнасці, якасць паслуг, якія прапаноўваюцца насельніцтву, за кошт аператыўнага кантролю за рухам аўтобусаў, магчымасці тэрміновай замены транспартнага сродку, што выйшаў са строю на маршруце, атрымаць сацыяльны і эканамічны эфект за кошт аўтаматызацыі кантролю адхіленняў маршрутаў і графікаў аўтобусаў. Не трэба забывацца і пра такі аспект, як павышэнне бяспекі перавозак пасажыраў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### ЗАГІНУЎ МІЛІЦЫЯНЕР. САМАГУБСТВА?

**Каля в. Уласы пад Баранавічамі 29 жніўня на прасёлачнай дарозе знайшлі забітага 23-гадовага ўчастковага міліцыянера, які са стрэлянай ранай галавы знаходзіўся ў аўтамашыне.**

Паводле папярэдняй інфармацыі, стрэл быў зроблены ў скронь з табельнай зброі. Пракуратура правярае розныя версіі, у тым ліку і самагубства.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

### ЮНАК ЗАСНУЎ У СЁМАЙ ВЫКРАДЗЕНАЙ МАШЫНЕ

**20-гадовы жыхар Пухавіцкага раёна спрабаваў выкрасці ў Мінску шэсць аўтамабіляў, аднак завесці змог толькі сёмы. Праўда, з-за спушчанага кола далёка з'ехаць на ім згоншчык не змог.**

Як паведаміла прэс-афіцэр Фрунзенскага РУУС Ала Галубовіч, вяртаючыся ад сяброў у Мінску, п'яны 20-гадовы жыхар Пухавіцкага раёна спрабаваў выкрасці шэсць аўтамабіляў у мікрараёне Сухарава. Дзверы ў двух з іх аказаліся адчыненымі, праўда завесці іх зламыснік не змог. А вось у сёмым аўтамабілі (ім аказаўся «Фальксваген LT») у замку быў абломак ключа. Праўда, у машыне было спушчана пярэдняе кола, і на 30-м кіламетры МКАД яно цалкам выйшла са строю. Ехаць далей малады чалавек не змог і проста заснуў у машыне. Яго разбудзілі супрацоўнікі Фрунзенскага ДАІ Мінска. Заведзена крымінальная справа за выкраданне, што цягне за сабой да 5 гадоў пазбаўлення волі.

**Алена КРАВЕЦ.**

### ПАЖАРНЫ ШОК

**У ноч з 4 на 5 верасня на пажары ў горадзе Асіповічы загінула 43-гадовая жанчына. Яна жыла разам з мужчынам: пара нідзе не працавала, перабівалася выпадковымі заробкамі і выпівала. Электрычнасць у доме адключылі за няплату, але кампаніі аматараў моцнага алкаголю гэта не спыняла. Пасля нядзельнай вечарынкі, уначы пачаўся пажар на верадзе, дзе спала жанчына. Мяркуецца, што прычынай стала неасцярожнае абыходжанне з агнём пры курэнні.**

5 верасня аўтаномны пажарны апавяшчальнік ўратаваў у падобнай сітуацыі жыццё 61-гадоваму жыхару вёскі Дразды Круглянскага раёна. Першую палову дня ён правёў у стылі «З раніцы выпіў — дзень вольны», а каб замацаваць задавальненне, пасля абеду мужчына прылёг адпачыць і закурыў у ложку. Прачнуўся ад рэзкага гуку і адкінуў коўдру, якая гарэла. Аднак у шоку ён не выклікаў выратавальнікаў і не зрабіў нічога, каб захаваць сваю маёмасць. Таму агнём практычна цалкам знішчаны дом і хлеў.

— За 8 месяцаў у Магілёўскай вобласці адбылося 728 пажараў, на якіх загінулі 112 чалавек, і больш за 90% ахвяр на час здарэння былі нецвярозымі, — пракаментавала **старшы інспектар цэнтра прапаганды і навучання пры Магілёўскім абласным УМНС Вольга НЕХАРОШЫХ** і яшчэ раз нагадала пра аўтаномны пажарны апавяшчальнік як дзейсны сродак бяспекі.

**Ілона ІВАНОВА.**

### З «ЛАСЁМ» — НА КАЗУЛЮ

**У паляўнічых угоддзях гаспадаркі «Лаўнікі» знайшлі рэшткі лася і казулі, пра што паведамілі работнікам Бягомльскай міжрайінспекцыі.**

На месцы дзяржінспектары высветлілі, што жывёла была здабытая незаконна: па звестках названага карыстальніка палявання тут не праводзілася. На месца выклікалі міліцыю. Побач з месцам разбору туш знайшліся сляды ад аўтамабіля «УАЗ». У выніку праведзеных мерапрыемстваў былі ўстаноўлены падазроны — зборшчык РУП «Мінскі трактарны завод». Работнікі міліцыі канфіскавалі ў парушальніка паляўнічы карабін «Лось» калібру 7,62 мм. Лагойскім РАУС за незаконнае паляванне заведзена крымінальная справа. Шкода ад дзеянняў браканьера ацэненая ў асабліва буйным памеры — на суму больш за 5,4 мільёна рублёў (155 базавых велічынь).

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### ДАПАМОГ...

**60-гадовы жыхар Пінска каля в. Юзефіны на аўтамабілі «Опель Вектра» заграз на полі і пайшоў у вёску па дапамогу. На выручку яму прыехаў на а/м «Опель Кадэт» знаёмы пенсіянер, які і паспрабаваў узяць аўтамашыну на буксір.**

У гэты час гаспадар «Опеля», які заграз, падкопваў пярэднія колы і апынуўся пад імі, калі памагаты пачаў рухацца наперад. Жыхар Пінска загінуў на месцы.

Устаноўлена, што кіроўца «Опель Кадэта» быў п'яны.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## БЕЛАРУСКАЯ ЧЫГУНКА: КУПЛЯЙЦЕ БЕЛАРУСКАЕ?

Спажывец

### Чаму беларускія чыгуначнікі не раяць купляць за мяжой білеты ў Беларусь?

**Яшчэ перад водпускам я выкупіў білет на аўтобус, якім збіраўся вяртацца з Франкфурта ў Мінск у пачатку верасня. Аднак у прызначаны дзень і час аўтобус у Франкфурт... не прыехаў.**

Каб высветліць прычыну адмены аўтобуса, я патэлефанаваў у аўтобусную фірму, якая прадавала білет. Аўтаадказчык паведаміў, што фірма працуе толькі па буднях (была субота), і прасіў тэлефанаваць у панядзелак. Аднак у панядзелак заканчвалася мая віза, таму чакаць яшчэ два дні я не мог — трэба было тэрмінова вяртацца ў Беларусь...

Вырашыў ехаць чыгункай. Дарога пралягала праз Берлін, Варшаву, Цярэспаль, Брэст... Білеты на ўвесь маршрут я мог купіць адразу ў Франкфурце. Здавалася б, зручна і выгадна. Усё так і было, пакуль я не прыехаў на беларускую мяжу. У акенцы міжнародных кас у Брэсце мне сказалі, што па білеце «Брэст — Мінск», які я набыў за 24 еўра ў Франкфурце, я ехаць не магу — трэба даплачваць. Абгрунтаваным было пытанне: каму, за што і навошта?

**БІЛЕТ НА ЭЛЕКТРЫЧКУ ЗА 24 ЕЎРА**

У касе мне сказалі, што білет, па якім я хачу даехаць да Мінска на цягніку «Брэст — Санкт-Пецярбург», не дзейнічае, бо на ім не пазначана месца, а каб месца «купіць», я павінен даплаціць Br 21 тысячу. Усё быццам добра, але каму я тады заплаціў 24 еўра?

— Рэч у тым, што за мяжой вы набываеце «голы» білет: ехаць па ім у Беларусі можна, але толькі ў электрычках, месцы ў якіх не пазначаюцца. Набыўшы білет у Германіі, вы заплацілі за яго згодна з міжнародным тарыфам, — тлумачыць сітуацыю **загадчык міжнародных кас Брэсцкага чыгуначнага вакзала Алена КАЛЮТАВА**. — 24 еўра вы заплацілі па міжнародным тарыфе. Звычайны ж білет з Брэста да Мінска на той жа цягнік па рэспубліканскім тарыфе каштуе Br29450. Купляць білет за мяжой, калі вы плануеце ехаць па тэрыторыі Беларусі, зусім нявыгадна. Таму мы заўсёды раім купляць білет толькі да мяжы, а там — аплачваць праезд па тарыфе ўжо той краіны.

***— Дык каму пойдзе сума, заплачаная мною ў Франкфурце?***

— Беларускаму боку. Бо, хоць вы і купілі білет за мяжой, ехалі вы па ім у Беларусі.

***— Атрымліваецца, у Германіі мне прадалі білет на электрычку?***

— Па гэтым білеце вы сапраўды можаце ехаць без даплаты толькі ў электрычцы. Аднак самі разумееце: шэсць гадзін і з усім прыпынкамі — вельмі доўга... Тэарэтычна вы маглі б ехаць па сваім білеце ў цягніку «Санкт-Пецярбург», калі б там былі вагоны без месцаў. Аднак там толькі плацкарт і купэ, таму з вас і ўзялі даплату.

Пазіцыя беларускай чыгункі зразумелая. Аднак адкуль жа іншаземцу ведаць, што білет у Беларусь, куплены ў Германіі, апынецца «катом у мяшку»? Дзе тут логіка, калі білет на электрычку, якая едзе «шэсць гадзін з усімі прыпынкамі», даражэйшы, чым на цягнік міжнародных зносін? Хочацца верыць, што такая практыка не з'яўляецца новай формай «прываблівання» турыстаў у Беларусь.

**Ілья ЛАПАТО.**

## БОНУСЫ І ЗНІЖКІ ДАВАЙ, А Ў АСАБІСТАЕ ЖЫЦЦЁ НЕ ЛЕЗЬ

**Міністэрства гандлю выступіла з папярэджаннем аб неправамоцнасці запатрабавання персанальных звестак грамадзян пры прадастаўленні апошнім зніжак.**

Сур'ёзная канкурэнцыя на рынку тавараў, работ, паслуг прымушае суб'екты гаспадарання выкарыстоўваць розныя механізмы для прыцягнення пакупнікоў, напрыклад, зніжкі, бонусы, прэміі, падарункі. Суб'екты прадпрымальніцкай дзейнасці маюць права даваць спажыўцам зніжкі ад вызначанай цаны. Аднак жа... Даючы зніжку, прадавец адначасова павінен захоўваць іншыя патрабаванні заканадаўства.

Так, у адпаведнасці з артыкулам 18 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб інфармацыі, інфарматызацыі і ахове інфармацыі», ніхто не мае права патрабаваць ад фізічнай асобы прадастаўлення інфармацыі пра яе прыватнае жыццё і персанальных звестак, уключаючы звесткі, што складаюць асабістую і сямейную тайну, тайну тэлефонных размоў, паштовых і іншых паведамленняў, якія датычацца стану яго здароўя, або атрымліваць такую інфармацыю іншым чынам між волі фізічнай асобы, акрамя выпадкаў, вызначаных заканадаўствам.

Міністэрства гандлю нагадвае, што пад персанальнымі звесткамі маецца на ўвазе сукупнасць асноўных і дадатковых персанальных звестак канкрэтных фізічных асобаў (пашпарт, пенсійнае пасведчанне, пасведчанне аб інваліднасці і інш.). Таму пры прадастаўленні зніжак, правядзенні акцый суб'ект гаспадарання не мае права збіраць персанальныя звесткі пакупнікоў без іх згоды, напрыклад, рабіць копіі, выпіскі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## УНІКАЛЬНЫЯ АПЕРАЦЫІ ПА ВЫДАЛЕННІ МІЖПАЗВАНОЧНАЙ ГРЫЖЫ З ДАПАМОГАЙ ЛАЗЕРА Ў БЕЛАРУСІ ПАСТАВЯЦЬ НА ПАТОК

**Унікальныя аперацыі па выдаленні міжпазваночнай грыжы з дапамогай лазера, якія праводзяць толькі ў РНПЦ траўматалогіі і артапедыі, плануецца паставіць на паток. Аб гэтым БЕЛТА паведаміў намеснік дырэктара па арганізацыйна-метадычнай рабоце гэтага РНПЦ Леанід ЛОМАЦЬ.**

Новую для Беларусі методыку па выдаленні міжпазваночнай грыжы з дапамогай лазера ў РНПЦ траўматалогіі і артапедыі пачалі прымяняць у студзені гэтага года. З гэтага часу тут прааперыравалі ўжо 20 чалавек. У будучым спецыялісты цэнтра разлічваюць паставіць гэтыя аперацыі на паток, значна павялічыўшы колькасць пацыентаў.

Як растлумачыў Леанід Ломаць, аперацыя па выдаленні міжпазваночнай грыжы з дапамогай лазера мае шэраг пераваг у параўнанні са звычайнай хірургічнай. Яе праводзяць пад мясцовай анестэзіяй, урач не робіць разрэзу, таму аперацыя менш траўматычная, пацыент значна хутчэй аднаўляецца, менш часу праводзіць у стацыянары.

Пакуль тэхналогія праходзіць апрабацыю, умоў для правядзення менавіта гэтага ўмяшання даволі шмат. Напрыклад, памер грыжы не павінен перавышаць 6 мм, перыяд ад пачатку захворвання да аперацыі — не больш за паўгода. Яшчэ адна абавязковая ўмова — адсутнасць эфекту ад кансерватыўнай тэрапіі. На аперацыю бяруць пацыентаў ва ўзросце ад 20 да 50 гадоў. Леанід Ломаць запэўніў, што па меры набыцця вопыту пералік умоў будзе звужацца.

Міжпазваночная грыжа — захворванне ў Беларусі даволі распаўсюджанае. Хоць многія пацыенты не падазраюць аб наяўнасці ў сябе такога дыягназу, не надаючы асаблівага значэння болям у спіне, пакуль болевы сіндром не становіцца больш моцным. Гэта тлумачыцца тым, што з-за грыжы нярэдка адбываецца сцісканне спіннога мозгу, што прыводзіць да боляў, пагаршэння адчувальнасці ў канечнасцях і нават да інваліднасці. Урачы рэкамендуюць лячыць міжпазваночную грыжу медыкаментозна. Аперацыю трэба рабіць толькі ў тым выпадку, калі лякарствы не дапамагаюць.

З года ў год у РНПЦ траўматалогіі і артапедыі павялічваюць аб'ём хірургічнай дапамогі пацыентам з міжпазваночнай грыжай. Калі ў 2009 годзе ў цэнтры правялі 269 аперацый па яе выдаленні, то ў 2010-м — 353, а за першае паўгоддзе 2011-га — 207.

У цэнтры пастаянна распрацоўваюць уласныя методыкі лячэння траўмаў і захворванняў пазваночніка і канечнасцяў. За мінулы год спецыялісты РНПЦ прапанавалі 3 ноу-хау ў галіне лячэбных і дыягнастычных тэхналогій, распрацавалі 3 камплекты доследных узораў вырабаў медыцынскага прызначэння і 7 серыйна выпускаемых або гатовых да выпуску канструкцый. Характэрна, што яны ў 3-5 разоў таннейшыя за імпартныя аналагі, шырока рэалізуюцца ў краінах СНД. Цяпер ідзе прапрацоўка пытання паставак на рынкі далёкага замежжа.

**ФИЛИАЛ «ЦЕНТР «БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ: 19 сентября 2011 г. в 11.30**
**состоится открытый аукцион (повторный) по продаже имущества, принадлежащего на праве собственности ОАО «Весоприбор» (продавец), в составе следующих лотов (предмет торгов):**

**ЛОТ № 2 – Комплекс зданий, сооружений и оборудования, расположенный по адресу: г. Бобруйск, ул. Крупской, 2, в составе: кап. строение с инв. № 710/С-58317 (здание заготовительно-штамповочного цеха) общ. пл. 1148,9 кв.м, с сооружениями: забор (ж./бет.) пл. 12 кв.м, забор (кирп.) пл. 135 кв.м, забор (метал. сетка) пл. 92 кв.м, ворота (метал.) пл. 11 кв.м, калитка (метал) пл. 2 кв.м, мощение (асф./бет.) пл. 326,75 кв.м; пути подкрановые; кап. строение с инв. № 710/С-51530 (здание склада ГСМ) общ. пл. 118,1 кв.м; кап. строение с инв. № 710/С-54307 (здание склада) общ. пл. 81,6 кв.м; кап. строение с инв. № 710/С-54308 (здание цеха голтовки) общ. пл. 111,7 кв.м; кап. строение с инв. № 710/С-54306 (здание трансформаторной подстанции) общ. пл. 30,1 кв.м; в том числе: оборудование КТП 10/04-1 х 400 (инв. № 62), кран-балка электрическая г/п 3 т (инв. № 184а), кран мостовой однобалочный г/п 3 т (инв. № 199, 191а), кран мостовой однобалочный г/п 5 т (инв. № 485), электрическая таль г/п 5 т (инв. № 1222, 1223), кран-укосина г/п 0,5 т (инв. № 1010)**

**ЛОТ № 4 – Кап. строение с инв. № 710/С-41497 (здание склада материалов и оборудования) общ. пл. 1 959,2 кв.м, расположенное по адресу: г. Бобруйск, ул. Крупской, 2, с сооружениями: подкрановая эстакада пл. 656 кв.м, забор (кирп.) пл. 187 кв.м, мощение (асф./бет.) пл. 654 кв.м**

| Общие сведения | Лот № 2 | Лот № 4 |
|---|---|---|
| Продавец | ОАО «Весоприбор», 213826, г. Бобруйск, ул. Дзержинского, 14/1 | |
| Организатор торгов | Филиал «Центр «Белтехинвентаризация», УНП 102353509, 220034, г. Минск, ул. Чапаева, д. 4, к. 222, (р/с 3012000511012 в ЗАО «Цептер Банк», ЦБУ 5 БИК 153001820, УНП 807000214, г. Минск, ул. Платонова, 1Б, ОКПО 55484006) | |
| Место проведения торгов и подачи документов | г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 в здании Бобруйского управления Филиала «Центр «Белтехинвентаризация» | |
| Начальная цена предмета торгов, рублей без учета НДС | 661 088 015 рублей, задаток 10% – 66 108 800 руб. | 411 168 548 рублей, задаток 10% – 41 116 850 руб. |
| Номер расчетного счета для перечисления задатка | Получатель платежа ОАО «Весоприбор» – р/с 3012000002968 в филиале 703 ОАО «СБ Беларусбанк» г. Бобруйск, код 760, УНП 700090810 | |
| Информация о земельном участке | 0,3418 га, в т.ч.: 0,3365 га – кадастр. № 741000000009001751 и 0,0053 га – кадастр. № 741000000009001746 | 0,2399 га – кадастровый № 741000000009001753 |
| | Правовой режим – постоянное пользование | |
| Условия продажи | Аукцион без условий | |
| Срок заключения договора купли-продажи | В течение 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукционных торгов | |
| Срок и условия оплаты за предмет торгов | Определяются по согласованию победителя торгов (претендента на покупку) с продавцом при заключении договора купли-продажи | |
| Срок подачи документов для участия в торгах, осмотра предмета торгов и внесения задатка | с 07 по 16 сентября 2011 г. включительно до 16.00 | |

*Более подробная инф. об условиях участия в аукционе, характеристиках предмета торгов, перечне документов, прилагаемых к заявлению на участие в аукционе, опубликована в газете «Звязда» № 30 (26894) от 16.02.2011 г.

**Получить доп. информацию о продаже имущества можно по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 или связавшись с нами по телефонам: 8 (0225) 52 08 45, 52 70 32, 8 (029) 654 79 06 в рабочие дни с 8.30 до 17.30.**

**Сенсацыйныя адкрыцці зроблены ў ходзе работ, якія вядуцца ў Спаса-Праабражэнскай царкве Спаса-Еўфрасіньеўскага манастыра ў Полацку беларускія і расійскія спецыялісты. Раскрыты выявы першых рускіх святых — пакутнікаў Барыса і Глеба.**

**У гэтым не было б нічога незвычайнага, калі б не час іх выявы — XII стагоддзе, праз крыху больш за стагоддзе пасля іх кананізацыі. Да гэтага часу самыя раннія выявы святых братоў датаваліся XIII стагоддзем. Насупраць сцяны, дзе раскрыты партрэты Барыса і Глеба, знаходзіцца вельмі рэдкая ў праваслаўных храмах на тэрыторыі Расіі, Украіны і Беларусі выява чэшскага святога Вацлава.**

**На здымку:** рэстаўратар вышэйшай кваліфікацыі, галоўны мастацтвазнаўца міжабласнога навукова-рэстаўрацыйнага мастацкага ўпраўлення Міністэрства культуры Расіі Уладзімір Сераб'янаў і навуковы кіраўнік работ, беларускі рэстаўратар Юрый Маліноўскі.

**Фота Аляксандра ХІТРОВА, БЕЛТА.**



## Ёсць нагода? Ёсць пытанне!

## ЛЯНІВЫ? МАГЧЫМА, НЕ ХАПАЕ ГЕНАЎ...

**НАВУКОЎЦЫ, вывучаючы мышэй, якія не любяць і не могуць доўга бегаць, прыйшлі да высновы, што прычынай ляноты можа быць адсутнасць генаў, якія адказваюць за сінтэз бялка, што рэгулюе энергабаланс клеткі. Пра гэта паведамляе «РИА Новости» са спасылкай на часопіс Proceedings of the National Academy of Sciences.**

Грэгары Стайнберг з канадскага ўніверсітэта Макмастэра, кіраўнік даследавання, вывучаў спецыяльна выведзеную папуляцыю мышэй, якіх пазбавілі двух генаў, што кантралююць выпрацоўку ферменту, неабходнага для нармальнага функцыянавання клеткі пры значным спажыванні энергіі. Паводзіны такіх мышэй значна адрозніваліся ад звычайных: здаровая мыш можа прабегчы некалькі кіламетраў, а асобіны без патрэбных генаў у мускулах маглі прабегчы толькі некалькі метраў. Аказалася, што ў гэтых «няправільных» грызуноў у клетках мускульнай тканкі менш мітахондрый (унутраных «электрастанцый», якія сінтэзуюць крыніцу энергіі ў клетцы — АТФ). Да таго ж, гэтыя клеткі горш паглынаюць глюкозу.

На думку вучоных, упершыню атрымалася прадэманстраваць прамую сувязь паміж працай мітахондрый і фізічнымі нагрузкамі. Гэтая выснова важная для людзей, якім цяжка забяспечыць сабе неабходны ўзровень фізічнай нагрузкі. Напрыклад, астматыкаў, людзей з лішняй вагой ці тых, хто любіць проста паляжаць на канапе.

### ШТО ДЛЯ ВАС ЗНАЧЫЦЬ ЛЕНАВАЦЦА?

**Ганна ШЧЫПКОВА, школьны псіхолаг:**

— Ёсць два віды ляноты: калі зусім нічога не хочацца рабіць, лянуешся нават варухнуцца, і хочацца толькі ляжаць на канапе і ні аб чым не думаць; і калі ты лянуешся рабіць штосьці, а замест гэтага робіш нешта іншае — так бы мовіць, дзейная лянота.

**Наталля БЯЛЯНАВА, старшыня грамадскага аб'яднання аховы жывёл «Эгіда»:**

— На жаль, у мяне такога няма. Праца, сям'я, восем жывёл, грамадская дзейнасць, толькі двух-трохгадзінны сон — няма калі ленавацца. Лянота для мяне недапушчальная. Я тады нічога паспяваць не буду.

**Ганна ДЗЯРУЖЫНА, фатограф:**

— Гэта значыць ляжаць на канапе, не рабіць задуманае, глядзець тэлевізар, марнаваць час. Часам хочацца так зрабіць, але ўсё ж такі ленавацца не люблю.

**Фёдар ЗАВАДСКІ, дырэктар аграгарадка «Кушлікі»:**

— Тым, хто працуе на зямлі, нельга ленавацца, бо будзеш тады жабраваць. Ленавацца — значыць нічога не рабіць, а калі нічога не рабіць, то і мець нічога не будзеш. Бывае, што з'яўляецца жаданне паленавацца: прылегчы ды нават газеты ў рукі не браць, каб і не думаць. Але перасільваем сябе, прымушаем працаваць. Вунь «Дажынкі» хутка, дык ад нас таксама работнікі паедуць, бо добра працуюць. Увогуле, у Беларусі няма, напэўна, лянівых людзей, усе звыклыя да працы.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

## Факт

### У цягніку Брэст — Масква канфіскавалі 8,8 кг кантрабанднага золата

**Аператыўнікі Мінскай рэгіянальнай мытні і супрацоўнікі транспартнай міліцыі канфіскавалі партыю кантрабанднага золата ў цягніку Брэст — Масква, паведамілі БЕЛТА ў прэсслужбе Дзяржаўнага мытнага камітэта.**

Партыю замкоў для ланцужкоў вагой больш за 8,8 кг польскай вытворчасці без якіх-небудзь таварасуправаджальных дакументаў перавозіў грамадзянін Расійскай Федэрацыі ў адным з купэ названага поезда. Пры гэтым на ювелірных вырабах адсутнічала прабірнае кляймо Беларусі, а дарагі тавар перавозіўся практычна на вачах ва ўсіх. Па гэтым факце пачаты адміністрацыйны працэс. У камітэце дадалі, што ўсяго за 8 месяцаў 2011 года супрацоўнікі мытных органаў пры спробах незаконнага ўвозу на тэрыторыю МС канфіскавалі больш за 28 тыс. штук вырабаў з каштоўных металаў агульнай вагой каля 18,2 кг.

## ВОЛЬНЫЯ ГУСІ І КАСТРУЛІ ДЛЯ СЫРУ

**Французскія фермеры са слаўгарадскімі сялянамі — за адну справу. За натуральныя харчы.**

У Слаўгарадскім раёне прынялі дэлегацыю французскіх сельскагаспадарчых вытворцаў. У межах праграмы абмену вопытам французы пазнаёміліся з беларускімі сялянамі і вырашылі, што на нашых натуральных харчах можна было б няблага зарабіць на Захадзе.

Замежнікі наведалі вёску Бязуевічы і агледзелі падсобную гаспадарку Алены Малахавай. Гаспадыня нядаўна пабывала ў Францыі і атрымала шмат уражанняў:

— Мяне найбольш здзівіла, што там працуюць у асноўным мужчыны. Жанчыну на французскай ферме не сустрэнеш.

Сама Алена зарабляе на жыццё толькі за кошт сваёй вялікай гаспадаркі: яна трымае 9 кароў, а таксама свіней, гусей, курэй, трусоў. Таму ў французскіх прыватных вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі Алена пацікавілася даходамі. Але госці толькі пажартавалі ў адказ: маўляў, каму трэба больш грошай — той мае больш сівых валасоў.

З іншага боку, французаў уразілі і некаторыя асаблівасці нашых падсобных гаспадарак: напрыклад, тыя ж бязуевіцкія гусі на вольным выпасе. Разам з тым, механізаваная дапамога ў падсобнай гаспадарцы ёсць: сучасны даільны апарат Малахава набыла з дапамогай мясцовага фонду развіцця сельскіх тэрыторый «Адраджэнне-Агра».

Цяпер фонд дапамогі дамовіцца аб супрацоўніцтве паміж французамі і Слаўгарадскім ліцэем № 3.

— Гэты праект будзе заключацца ў абмене людзьмі, — паведаміла дырэктар фонду Таццяна Гурына. — Нашы студэнты паедуць у Францыю і папрацуюць там, а французы — да нас.

Таксама з удзелам замежнікаў фонд рэалізуе на Слаўгарадчыне праект адраджэння старадаўніх традыцый сыраварства. Рэцэптамі беларускіх хатніх сыроў нават зацікавіўся турэцкі прадпрымальнік і прасіў прадаць яму абсталяванне.

— Вось мы і ўсміхаемся: якое ў беларускага селяніна абсталяванне для вытворчасці сыроў? — здзіўляецца Таццяна Гурына. — Печ ды каструлі!

Але, відаць, турак, як, дарэчы, і французскія госці, ацанілі якасць і, галоўнае, натуральнасць харчоў, якія вырабляюцца слаўгарадскімі вясковымі гаспадарамі. Фермеры з Францыі падкрэслілі, што вытворчасць экалагічна чыстых харчоў — гэта правільны кірунак, і трэба працягваць у ім працаваць.

**Ілона ІВАНОВА.**

### 7 ДЗЁН — 7 ВАЛЮТЧЫКАЎ

**У Магілёўскай вобласці за тыдзень затрымалі сем валютчыкаў.**

Складзены адміністрацыйныя пратаколы, і канфіскаваны буйныя сумы грошай: больш за 9 тысяч долараў, 42 тысячы расійскіх рублёў, 20,5 мільёна беларускіх рублёў, 50 еўра. Найбольш затрыманняў — у Магілёве і Бабруйску.

**Ул. інф.**

## Абзац

◢ ДАІ Гродна прадаставіла звесткі пра самыя купляемыя (пастаўленыя на ўлік) аўтамабілі ў горадзе сёлета за 8 месяцаў. Рэйтынг папулярнасці (па ўбыванні) аўто выглядае так: «Фальксваген Пасат», «Опель Зафіра», «Опель Астра», «Аўдзі А6, «Аўдзі А4», «Фальксваген Гольф», «Рэно Меган Сцэнік», «Пежо 307», «Фальксваген Шаран», «Рэно Лагуна».

**◢ З пачатку года ў краіне грыбамі атруціліся 92 чалавекі, адзін з іх памёр. Ад атручэння грыбамі загінула жанчына 1968 года нараджэння, жыхарка Мазыра. На думку медыкаў, яна памерла ад ужывання ў ежу беднай паганкі. Жанчына позна звярнулася па медыцынскую дапамогу. Летась з-за атручэння грыбамі ў Беларусі памерла 9 чалавек.**

◢ Аграрыі Гомельскай вобласці будуць вырошчваць сланечнік у прамысловых маштабах. Налета пасевы гэтай культуры зоймуць на Гомельшчыне 70 тыс. га. Спецыялісты мяркуюць, што такое рашэнне будзе эканамічна мэтазгодным.

## Поўны абзац

**◢ Каза з гранатай перапалохала ўкраінскія спецслужбы. У адным з прыватных двароў у пасёлку Белакуракіна (Луганская вобл.) каза, што была навязаная на лужку, выявіла гранату Ф-1 часоў Другой сусветнай вайны. Жывёліна ці то рагамі, ці то капытом вырыла з-пад зямлі частку ржавага металічнага прадмета. Дзесяцігадовая дачка гаспадара зацікавілася незвычайным прадметам, падабрала яго і паказала бацьку. Вызначыўшы, што ў руках дзіцяці баявая граната, мужчына жахнуўся. Ён неадкладна праінфармаваў аб выпадку экстранныя службы. Зона была ацэпленая і ўзятая пад ахову. Пададзена заяўка на абясшкоджванне гранаты.**

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

## Вёска на палове тысячагоддзя

**У Касцюковіцкім раёне адзначылі 500-гадовы юбілей адной са старэйшых і прыгажэйшых вёсак — Канічы.**

На свяце ў Канічах урачыста ўшанавалі славутых землякоў, ветэранаў працы, залатых юбіляраў і маладыя пары. Канцэрт, выстава-продаж вырабаў народных майстроў, святочны гандаль. Усё гэта адбывалася на фоне паўразбуранага будынка панскага бровара, якому амаль сотня гадоў.

Сучаснае і старажытнае суседнічае ў Канічах. Гэтая вёска мае багатую гісторыю: яе назва, хутчэй за ўсё, пайшла ад кірмашу коней, але

Каніцкі касцёл.



сялянам больш падабаецца гісторыя пра прыгажуню Каню, якая ад няшчаснага кахання кінулася ў рачны вір.

Самы значны помнік дойлідства ў Канічах — вялікі касцёл, назву якога і год заснавання ніхто не памятае. Мяркуецца, што гэта другая палова XIX стагоддзя. Велічны будынак з цёмна-чырвонай цэглы, на жаль, паўразбураны: даху няма, і ўсюды растуць дрэвы.

Касцёл, бровар і іншыя збудаванні, ад якіх мала што засталося, належалі панам Цеханавецкім. Яны з'ехалі з Канічаў пасля рэвалюцыі 1905 года. Нашчадкі Цеханавецкіх нібыта жывуць у Англіі і сваёй былой маёмасцю на ўсходзе Беларусі не цікавяцца.

Сёння Канічы — не самая перспектыўная вёска ў Касцюковіцкім раёне, бо там жыве шмат пенсіянераў. Сваю будучыню жыхары Канічаў звязваюць з развіццём сельскай гаспадаркі і турызму.

**Ілона ІВАНОВА.**

## «Цень Іерусаліма» ў Віцебску

**У Віцебскім абласным краязнаўчым музеі па ініцыятыве пасольства Ізраіля ў Беларусі прадстаўлена выстава работ вядомага ізраільскага майстра фота Леаніда Падруля.**



Фота з выставы: «Апакаліпсічны пейзаж».

«Цень Іерусаліма» (такую назву мае выстава) — гэта ўнікальныя фотаздымкі з натуры без усякай камп'ютарнай апрацоўкі. Мэта выставы, як тлумачыць сам аўтар, — звярнуцца да ўнутранага свету чалавека, зацікавіць яго гісторыяй падзей, якія адбыліся ў біблейскія часы на зямлі Ізраіля, і тымі, што адбываюцца ў сучаснасці ў гэтай краіне.

Выстава ў кастрычніку мінулага года дэманстравалася ў сталіцы Беларусі, пасля чаго «падарожнічала» па беларускіх гарадах. Цяпер яе ўбачаць і жыхары Прыдзвінскага краю.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## Спорт-тайм

### ПАДАПЕЧНЫЯ ГЕОРГІЯ КАНДРАЦЬЕВА ЗГУЛЯЛІ ЎНІЧЫЮ СА ЗБОРНАЙ РАСІІ

**Алімпійская зборная Беларусі па футболе, якая заваявала пуцёўку ў Лондан-2012, правяла таварыскі матч з другой зборнай Расіі, якую трэніруе нядаўна звольнены з «Лакаматыва» Юрый Краснажан. Паядынак праходзіў у Бранску на стадыёне «Дынама» пры падтрымцы амаль 10 тысяч балельшчыкаў. Матч завяршыўся ўнічыю 0:0.**



Паводле двухбаковага пагаднення каманды маглі праводзіць неабмежаваную колькасць замен, і ў нашай камандзе выйсці на поле атрымалі шанц амаль усе прывезеныя ў Бранск Георгіем Кандрацьевым футбалісты, за выключэннем абаронцы «Гомеля» Сяргея Матвейчыка, а таксама Паўла Няхайчыка і Максіма Скавыша.

### КАПСКАГА І ГАНЧАРЭНКУ ПАКАРАЛІ. ГУШЧАНКА НЕВІНАВАТЫ

**Матч, які спецыялісты і заўзятары называюць самым цікавым у сёлетнім чэмпіянаце, — паміж БАТЭ і «Дынама», што адбыўся больш за тыдзень таму, дагэтуль не дае спакою.**

Паядынак завяршыўся ўнічыю 2:2, але вызначыўся неадназначным судзействам, выдаленнем варатара барысаўчан Гутара, сутыкненнем дынамаўскага галкіпера Гушчанкі з нападаючым БАТЭ Радзівонавым. Падчас гэтага сутыкнення Гушчанка прамой нагой ударыў форварда, які атрымаў чарговую траўму і выбыў на паўгода... Анатоль Капскі і Віктар Ганчарэнка эмацыянальна адрэагавалі на траўму вядучага футбаліста, у прыватнасці, уладальнік клуба выказаўся ў «непарламенцкіх» выразах на адрас судзейскай брыгады, а Віктара Ганчарэнку ледзь утрымалі ад выхаду на поле...

Дысцыплінарны камітэт федэрацыі футбола разгледзеў паядынак і прызнаў, што Віктара Ганчарэнку і Анатоля Капскага трэба дыскваліфікаваць на 4 матчы і пакараць штрафам у 700 тысяч кожнага. Выканкам АБФФ таксама разглядаў эпізод з удзелам Гушчанкі і Радзівонава і сышоўся ў думцы, што галкіперу «Дынама» трэба было паказаць чырвоную картку. Аднак злога намеру ў дзеяннях варатара не знайшлі, ён можа выходзіць на поле ў наступным матчы. У адрозненне ад калегі з Барысава Гутара, які аўтаматычна атрымаў дыскваліфікацыю за выдаленне.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

### БЕЛАРУСЫ ЗАВАЯВАЛІ 24 МЕДАЛІ НА ЮНІЁРСКІМ ЧЭМПІЯНАЦЕ ЕЎРОПЫ ПА ВАДНАЛЫЖНЫМ СПОРЦЕ

**Беларускія спартсмены заваявалі 24 медалі (11 залатых, 5 сярэбраных, 8 бронзавых) на юніёрскім чэмпіянаце Еўропы па водналыжным спорце за электрацягай, які прайшоў у Любліне (Польшча), паведамляе БЕЛТА.**

У спаборніцтвах сярод юніёраў да 19 гадоў адразу 3 залатыя медалі на рахунку Ганны Стральцовай (у мнагабор'і, фігурным катанні і скачках з трампліна), 2 медалі вышэйшай пробы ў актыве Аляксандра Ісаева (у мнагабор'і і фігурным катанні). Акрамя таго, зборная Беларусі заняла 1-е месца ў камандным заліку.

У спаборніцтвах юных воднальжнікаў да 15 гадоў адразу 3 залатыя медалі заваявала Кацярына Кісялёва (у мнагабор'і, слаламе і фігурным катанні). Сярод юнакоў 1 золата на рахунку Аляксандра Міхайлава (у фігурным катанні), у камандным заліку сярод 15-гадовых спартсменаў зборная Беларусі таксама заняла 1-е месца.

# ГНЯЗДУЙСЯ, ПУСТАЛЬГА!



(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У невялікім, але даволі старым хвойніку абапал дарогі з чыгуначнага прыпынку да жылога шматпавярховага квартала гняздуецца каля дзясятка пар птушкі-чырванакніжніцы. Амаль дзесяць гадоў вялося сапраўднае змаганне за наданне гэтаму куточку ахоўнага статусу. Ідэя зыходзіла ад мачулішчанскіх школьнікаў — членаў клуба аматараў прыроды «Біяразнастайнасць», якія яшчэ ў 2000 годзе выявілі гэтую рэдкую птушыную калонію і навукова абгрунтавалі неабходнасць захавання мясцовай папуляцыі. Адна са школьных навуковых прац была настолькі моцнай і пераканаўчай, што яе аўтарка Таццяна Каравай атрымала нават прэзідэнцкую стыпендыю.

Амаль пяць гадоў таму быў выраблены гэты плакат-аншлаг з выявай птушкі і назвай заказніка, і ў мінулую суботу падчас прыезду валанцёраў на прыборку тэрыторыі быў нарэшце ўсталяваны.

— Для многіх жыхароў нашага пасёлка гэта вельмі значная падзея, бо яны таксама дапамагалі берагчы і ахоўваць унікальны куток, — кажа спецыяліст па экалагічнай адукацыі грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» Руслан Шайкін. — Для многіх будзе нечаканасцю ўбачыць і прачытаць гэтую інфармацыю, бо цяпер тут нельга, як раней, разводзіць агонь, кідаць смецце, шумець. Многія ж прывыклі жыць менавіта так.

Другі год запар на тэрыторыі сокала-пустальгі (а гэта менавіта птушыная тэрыторыя) адбываюцца акцыі па зборы смецця. У акцыі ёсць і свая назва — «Узляці высока!» Распачалі яе арганізатары вядомых прафесійных конкурсаў «Брэнд года». Маладыя людзі збіралі смецце, якое накаплівалася тут гадамі ці засталося пасля нядаўніх нядбалых адпачывальнікаў. Да валанцёраў далучыліся ахвочыя з фабрыкі «Мілавіца», Міжнароднага рэзервовага банка, кансалтынгавая кампанія САЦІА, іншых сталічных кампаній. Вядома, не засталіся ў баку мясцовыя школьнікі. А вядомы «Пінскдрэў» не толькі даслаў сваіх прадстаўнікоў, але і выдаткаваў матэрыял для вырабу скрынь для штучных гнёздаў.

— Цяпер гэта не проста тэрыторыя, важная для птушак, а тэрыторыя, якая ахоўваецца дзяржавай, — кажа былы школьны настаўнік-біёлаг з Мачулішчаў і колішні кіраўнік клуба «Біяразнастайнасць» Руслан Шайкін.— Ахоўваць «Сакаліны» зусім не цяжка, бо гэта адзін з самых маленькіх па тэрыторыі ў нашай краіне заказнікаў, ён усяго дваццаць з невялікім гектараў.

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**

*Мінскі раён.*









Выстава

# ДЗЕЛАВЫ ФОРУМ ДЛЯ ПРАФЕСІЯНАЛАЎ АД БУДОЎЛІ



**Будаваць кватэру або дом ці не? Для чалавека, які мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, пры большменш спрыяльных умовах адказ на гэтае пытанне, відавочна, адзін: так. У час складаны на гэтае рашэнне можа паўплываць шэраг фактараў, найперш тут ужо шмат залежыць або ад уласнай кішэні прыватнай асобы, або ад падтрымкі яе дзяржавай. І калі застацца без уласнага куточка на нейкі час для асобна ўзятай сям'і крыўдна і непрыемна, усё ж гэта прыватны выпадак. Аднак такіх сем'яў шмат, таму для краіны клопат аб узвядзенні не толькі жылля, але і іншых сацыяльна значных аб'ектаў — задача дзяржаўная. Паспяхова вырашаць яе прадстаўнікам галіны дапамагае, у прыватнасці, міжнародная спецыялізаваная выстава «Будпрагрэс», якая ладзіцца раз на год пры нязменнай падтрымцы Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва. З 6 па 9 верасня ў выставачным комплексе па сталічным праспекце Пераможцаў, 20/2 гэты форум сёлета ў 19-ы раз сустракае наведнікаў.**

...Прызнаюся шчыра, калі яшчэ да афіцыйнага адкрыцця форуму набліжаўся да выставачнага комплексу, баяўся расчаравацца: раптам з-за цяперашніх не вельмі спрыяльных умоў колькасць удзельнікаў выставы зменшыцца? Не будзе на што паглядзець, пра што напісаць? Аднак ужо здалёк адкрытая пляцоўка перад уваходам, цалкам застаўленая будаўнічай тэхнікай, засведчыла, што асцярогі дарэмныя. Унутры павільёна таксама віравала жыццё: ішла рэгістрацыя ўдзельнікаў, заканчваўся мантаж экспазіцый. У форуме сёлета щзялі ўдзел дзясяткі айчынных прадпрыемстваў розных формаў уласнасці і падпарадкаванасці, а таксама замежныя фірмы і арганізацыі з Польшчы, Турцыі, Літвы, Германіі, Расіі. Усе яны дэманстравалі апошнія навінкі сваёй прадукцыі, прызначанай для будаўнічага рынку...

...Спецыялізаваная міжнародная выстава «Будпрагрэс» разлічана найперш не на шэраговага спажыўца, а на прафесіяналаў. Таму ніводны такі форум не абыходзіцца без насычанай дзелавой праграмы. Не стане выключэннем і цяперашняя выстава: падчас яе правядзення запланаваныя прэзентацыі асобных фірмаў, канферэнцыі, семінары, на якіх будуць абмяркоўвацца актуальныя праблемы будаўнічага комплексу.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.**




Ведай нашых!

# Аляксандры Герасімені прысвоена ганаровае званне «Мінчанін года»

**Ганаровае званне «Мінчанін года» прысвоена 13 жыхарам сталіцы. Такое рашэнне напярэдадні Дня горада прыняў Мінгарвыканкам, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе мэрыі.**



Фота БЕЛТА.

Права насіць такое званне гараджане заслужылі высокімі дасягненнямі ў працы, асаблівым асабістым укладам у сацыяльна-эканамічнае і культурнае развіццё Мінска па выніках работы за 2010-2011 гады.

Ганаровае званне «Мінчанін года» прысвоена: у галіне прамысловасці — гендырэктару ЗАТ «Вітэкс» Віктару Цярэшчанку, у галіне транспарту і сувязі — дырэктару аўтобуснага парка № 7 Уладзіміру Рамانаву, у галіне будаўніцтва — муляру будаўнічага ўпраўлення № 256 ААТ «МАПІД» Фёдару Русаку, у галіне жыллёва-камунальнай гаспадаркі — дырэктару КУП «Мінсккамунцепласетка» Уладзіміру Аляксандраву, у галіне аховы здароўя — дырэктару РНПЦ «Маці і дзіця» Канстанціну Вільчуку, у галіне вышэйшай адукацыі і навукі — дырэктару Навукова-даследчага інстытута фізіка-хімічных праблем БДУ Таццяне Гаеўскай, у галіне сярэдняй адукацыі — настаўніку пачатковых класаў сярэдняй агульнаадукацыйнай школы № 99 Юліі Бяловай, у галіне культуры — балетмайстру Заслужанага аматарскага калектыву Беларусі ансамбля эстраднага танца «Гарэзлівыя агеньчыкі» Мінскага Палаца культуры і спорту чыгуначнікаў Валерыю Бураму, у галіне фізічнай культуры, спорту і турызму — спартсмену-інструктару нацыянальнай каманды Беларусі па плаванні, чэмпіёнцы свету па плаванні Аляксандры Герасімені, у сферы сацыяльнай абароны насельніцтва — старшыні грамадскага аб'яднання «Беларуская асацыяцыя шматдзетных бацькоў», Мінскай гарадской арганізацыі грамадскага аб'яднання «Беларуская асацыяцыя шматдзетных бацькоў» Таццяне Краўчанка, у сферы гандлю і грамадскага харчавання — дырэктару СЗАТ «Прастор Маркет» Інесе Захарэвіч, у сферы бытавога абслугоўвання — майстру ВКУП «Белхімчыстка» Людміле Комлік, у праваахоўнай сферы, органах і падраздзяленнях па надзвычайных сітуацыях, мытных органах, сілавых структурах — начальніку штаба галоўнага ўпраўлення ўнутраных спраў Мінгарвыканкама Ігару Тумашу.

Мінчанам года будуць уручаны дыпломы, нагрудныя знакі і грашовыя прэміі ў памеры 25 базавых велічынь (адна базавая велічыня складае Br35 тыс.) кожнаму. Урачыстая цырымонія адбудзецца ў час святкавання Дня горада 10 верасня ў Беларускім дзяржаўным акадэмічным музычным тэатры. Званне «Мінчанін года» прысвойваецца ў сталіцы з 2002 года.

ТАБЛИЦА ПРОЦЕНТНЫХ СТАВОК ПО СРОЧНОМУ БАНКОВСКОМУ ВКЛАДУ (ДЕПОЗИТУ) ОАО «БЕЛАГРОПРОМБАНК»
**с 07 сентября 2011 г.**

| Сумма депозита, ед. валюты | Вклады (депозиты) с плавающими процентными ставками, % годовых. Срок, дни: 100 | 200 | 300 | 500 | 1 000 | 2 000 | 3 000 | Вклады (депозиты) с фиксированными процентными ставками, % годовых. Срок, дни: 100 | 200 | 300 | 500 | 1 000 | 2 000 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Белорусские рубли** | | | | | | | | | | | | | |
| 1 – 1 000 000 | 29,00 | 30,00 | 31,00 | 35,00 | 35,15 | 35,25 | 35,35 | 18,50 | 19,00 | 19,50 | 20,00 | 20,50 | 21,00 |
| 1 000 001 – 10 000 000 | 29,50 | 30,50 | 31,50 | 35,10 | 35,20 | 35,30 | 35,40 | 18,75 | 19,25 | 19,75 | 20,25 | 20,75 | 21,25 |
| 10 000 001 и более | 30,00 | 31,00 | 32,00 | 35,15 | 35,25 | 35,35 | 35,50 | 19,00 | 19,50 | 20,00 | 20,50 | 21,00 | 21,50 |
| **Доллары США** | | | | | | | | | | | | | |
| 1 – 500 | 7,60 | 8,20 | 8,80 | 9,40 | 9,60 | 9,80 | 9,90 | 5,00 | 5,80 | 6,40 | 6,80 | 7,20 | 7,60 |
| 501 – 5 000 | 7,80 | 8,40 | 9,00 | 9,50 | 9,70 | 9,85 | 9,95 | 5,30 | 6,00 | 6,60 | 7,00 | 7,40 | 7,80 |
| 5 001 и более | 8,00 | 8,60 | 9,20 | 9,60 | 9,80 | 9,90 | 10,00 | 5,60 | 6,20 | 6,80 | 7,20 | 7,60 | 8,00 |
| **Евро** | | | | | | | | | | | | | |
| 1 – 500 | 7,60 | 8,20 | 8,80 | 9,40 | 9,60 | 9,80 | 9,90 | 5,00 | 5,80 | 6,40 | 6,80 | 7,20 | 7,60 |
| 501 – 5 000 | 7,80 | 8,40 | 9,00 | 9,50 | 9,70 | 9,85 | 9,95 | 5,30 | 6,00 | 6,60 | 7,00 | 7,40 | 7,80 |
| 5 001 и более | 8,00 | 8,60 | 9,20 | 9,60 | 9,80 | 9,90 | 10,00 | 5,60 | 6,20 | 6,80 | 7,20 | 7,60 | 8,00 |
| **Российские рубли** | | | | | | | | | | | | | |
| 1 – 15 000 | 8,60 | 9,20 | 9,80 | 10,40 | 10,60 | 10,80 | 10,90 | 6,00 | 6,80 | 7,40 | 7,80 | 8,20 | 8,60 |
| 15 001 – 150 000 | 8,80 | 9,40 | 10,00 | 10,50 | 10,70 | 10,85 | 10,95 | 6,30 | 7,00 | 7,60 | 8,00 | 8,40 | 8,80 |
| 150 001 и более | 9,00 | 9,60 | 10,20 | 10,60 | 10,80 | 10,90 | 11,00 | 6,60 | 7,20 | 7,80 | 8,20 | 8,60 | 9,00 |

Подробные условия вклада «Линия роста» в газетах: «Советская Белоруссия» № 49 от 16.03.2006, «Звязда» № 50 от 04.03.2006, на сайте банка в сети Интернет – www.belapb.by и в офисах ОАО «Белагропромбанк».
Информация о размере процентов, выплаченных по привлеченным средствам физических лиц в течение последнего финансового года, – в офисах и на сайте банка.
Полная сохранность и возврат денежных средств физических лиц, размещенных в ОАО «Белагропромбанк», гарантируются государством и осуществляются в соответствии с законодательством РБ.
Сведения о выплаченных процентах по привлеченным средствам физических лиц в 2010 году в эквиваленте, тыс. бел. руб.:

| | Январь | Февраль | Март | Апрель | Май | Июнь | Июль | Август | Сентябрь | Октябрь | Ноябрь | Декабрь | Итого |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Срочные вклады (депозиты) | 22 150 017 | 22 217 382 | 26 283 012 | 23 570 773 | 24 305 769 | 23 429 778 | 24 105 505 | 25 734 923 | 23 504 004 | 21 902 005 | 22 376 779 | 20 939 428 | 280 519 376 |
| До востребования | 109 717 | 112 167 | 154 527 | 147 164 | 130 440 | 153 009 | 175 320 | 208 613 | 207 977 | 209 476 | 234 959 | 253 869 | 2 097 239 |

ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136
Время работы Контакт-Центра Банка: 8.00 - 20.00 - рабочие дни; 8.00 - 18.00 - выходные и праздничные дни.
Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, МТС) - по тарифам операторов связи.
Консультации оказываются бесплатно.

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 22.07.2009 № 2, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

Добрая навіна

# РЭКАНСТРУЯВАНЫ «ЦЭНТРАЛЬНЫ» АЎТАВАКЗАЛ ХУТКА ПРЫМЕ ПЕРШЫХ ПАСАЖЫРАЎ




Такім ён быў...



...такім ён стаў.

**З 10 верасня «Цэнтральны» аўтавакзал у Мінску пачне прымаць аўтобусы міжгародніх маршрутаў. Пра гэта «Звяздзе» распавяла начальнік аддзела перавозак філіяла «Мінскі аўтавакзал» КТУП «Мінсктранс» Юлія Старавойтава. Спыніць сваё існаванне і часовы прыпынак на вуліцы Дружнай.**

У новым аўтавакзале мінчан будуць чакаць сучасныя памяшканні, гандлёвы корпус, паркінг на 500 машына-месцаў, абноўлены ў параўнанні з 2007 годам аўтапарк і многае іншае. Адным з цікавых архітэктурных рашэнняў будуць пасадачныя платформы непасрэдна пад будынкам вакзала, — менавіта для гэтага ён пастаўлены на калоны.

Аўтавакзал «Цэнтральны» стаў першым транспартным аб'ектам такога тыпу ў БССР, адкрыты ён быў 1962 годзе і 45 гадоў адпрацаваў на карысць мінчан і гасцей сталіцы. Аднак пасля будаўніцтва новага чыгуначнага вакзала аўтавакзал ужо не адпавядаў новай канцэпцыі Прывакзальнай плошчы. Да таго ж памяшканне было нефункцыянальным і не дазваляла аўтавакзалу прэтэндаваць на статус міжнароднага. А таму ўлетку 2007-га стары будынак быў зачынены і затым дэмантаваны, а на яго месцы неўзабаве паўстаў новы сучасны транспартны комплекс. На час рэканструкцыі нагрузку па перавозцы пасажыраў на сябе ўзялі вакзалы «Маскоўскі» і «Усходні», а таксама аўтастанцыя «Паўднёва-Заходняя».

У новым будынку завяршаюцца работы перад адкрыццём, будаўнікі робяць апошнія штрыхі перад здачай. Аўтавакзал выцягнецца ўздоўж вуліцы Бабруйскай і будзе нагадваць прыпынены цягнік, прычым знешне ён выкананы ў стылі свайго суседа — чыгуначнага вакзала.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
**Фота аўтара.**

# ЗАЎСЁДЫ ГАТОВЫ ДА БОЮ ЭКІПАЖ!

11 верасня — 65-я гадавіна Дня танкістаў





Поўным ходам ідзе адпраўка войскаў Паўночна-заходняга аператыўнага камандавання для ўдзелу ў сумесным аператыўным вучэнні Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі «Шчыт Саюза-2011». 5 верасня са станцыі пагрузкі «Азярышча» для выканання задач вучэнняў на расійскі палігон «Ашулук» адправіліся каля трыццаці адзінак тэхнікі 355-га гвардзейскага асобнага танкавага батальёна 120-й гвардзейскай асобнай механізаванай брыгады. На вучэнні вайскоўцы адправіліся напярэдадні свайго прафесійнага свята — кожны год у другую нядзелю верасня ў Беларусі святкуецца Дзень танкістаў.

— Якраз сваё прафесійнае свята, 11 верасня, мы правядзём у працы, — дзеліцца думкамі камандзір батальёна Мікалай Шуміхін. — Наперадзе шэсцьсем сутак у дарозе, больш за дзве тысячы кіламетраў. Удзел у дадзеных вучэннях дазволіць нам павысіць палявую вывучку асабовага складу, іх здольнасць сумесна з расійскімі вайскоўцамі выконваць вучэбна-баявыя задачы.

**Марына БЕГУНКОВА. Фота аўтара.**



Каментарый

# ІНСТРУКЦЫЯ ДА ДЗЕЯННЯ

**ПЛАН дзеянняў Нацбанка і ўрада Беларусі, рэгіянальных органаў кіравання па стабілізацыі фінансава-эканамічнай сітуацыі, які агучыў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка на нарадзе па пытаннях сацыяльна-эканамічнага развіцця, быў дасканала і глыбока прапрацаваны. У ім улічаны як эканамічныя, так і сацыяльна-палітычныя аспекты. На нарадзе з кароткімі справаздачамі аб сітуацыі ў рэгіёнах выступілі ўсе старшыні аблвыканкамаў. Яны падтрымалі прапанаваныя меры і не ўнеслі прапаноў па змяненні канцэпцыі. План прапрацаваны да такой ступені, што практычна немагчыма штосьці дадаць. «Самымі важнымі, на мой погляд, з'яўляюцца словы кіраўніка дзяржавы, што Беларусь застаецца сацыяльнай дзяржавай і галоўным у яе палітыцы па-ранейшаму з'яўляецца клопат пра чалавека», — так пракаментаваў вынікі нарады ў Прэзідэнта старшыня Гомельскага аблвыканкама Уладзімір ДВОРНІК.**

Кіраўнікі на месцах разумеюць: цяпер павінен яшчэ больш напружана працаваць рэальны сектар эканомікі. Неабходна як мага больш выпрацоўваць добрай і канкурэнтаздольнай прадукцыі, якая ішла б на экспарт і прыносіла б для краіны дастатковую колькасць валюты, неабходнай для куплі за мяжой энергарэсурсаў і іншых жыццёва важных кампанентаў для нармальнага функцыянавання народнай гаспадаркі. Іншых шляхоў няма. Толькі паспяховая работа прадпрыемстваў прамысловасці, сельскай гаспадаркі, будаўнічага комплексу, сферы паслуг можа хутка стабілізаваць фінансава-эканамічную сітуацыю, выконваючы адначасова функцыю лакаматыва ў падтрымцы далейшага развіцця ўсёй сацыяльнай сферы.

Што датычыцца Гомельскай вобласці, то, як адзначыў Уладзімір Дворнік, эканоміка рэгіёна менавіта ў такім рэжыме і працуе. У гэтым годзе прырост прамысловай вытворчасці склаў 10,2 працэнта, рост вытворчасці забяспечаны на прадпрыемствах усіх асноўных галін. Пры гэтым павелічэнне выпуску прадукцыі не суправаджаецца затаварваннем складоў. Узровень запасаў гатовай прадукцыі ў цэлым па вобласці склаў 37,2 працэнта сярэднямесячнага аб'ёму вытворчасці. Гомельскія таваравытворцы істотна (у 1,8 раза) павялічылі пастаўкі за межы краіны, тэмп росту экспарту амаль у два разы апярэджвае тэмп росту імпарту.

«Безумоўна, збаўляць набраныя тэмпы рэгіён не збіраецца», — адзначыў Уладзімір Дворнік. Паводле яго слоў, рэзервам можа стаць унутрыабласная кааперацыя. Асобныя прадпрыемствы, на жаль, яшчэ пакуль маюць загружанасць сваіх вытворчых магутнасцяў напалавіну. Гэта вельмі марнатраўна з пункту гледжання эфектыўнага гаспадара. Загрузіўшы ж невыкарыстоўваемыя магутнасці, можна не толькі стварыць дадатковыя рабочыя месцы, але і значна зменшыць аб'ёмы імпарту для патрэб прамысловасці. Праведзены ўжо нарады з дырэктарамі буйнейшых прадпрыемстваў, якія выказалі гатоўнасць размяшчаць частку сваіх заказаў на камплектуючыя ўнутры вобласці.

Акрамя таго, у якасці істотнага рэзерву старшыня Гомельскага аблвыканкама назваў далейшае паляпшэнне работы аграпрамысловага комплексу. Галоўнае для гэтай галіны — нарошчванне аб'ёмаў вытворчасці сельгаспрадукцыі. Кожны дадаткова выраблены і перапрацаваны кілаграм мяса або малака — гэта ў тым ліку і дадатковыя валютныя паступленні ў эканоміку.

Што датычыцца спажывецкага рынку, то мясцовыя ўлады ў цэлым кантралююць сітуацыю. Нягледзячы на блізкасць мяжы з Расійскай Федэрацыяй, удаецца падтрымліваць у гандлёвай сетцы неабходны асартымент харчовых і нехарчовых тавараў. У бліжэйшыя дні па ўсёй вобласці пачнуцца кірмашы па продажы сельскагаспадарчай прадукцыі. У рэгіёне вырашчаны добры ўраджай агародніны і бульбы, таму купіць іх у любой колькасці і па прымальных цэнах зможа кожны ахвотны.

Паводле слоў губернатара, асаблівая ўвага, як заўсёды, будзе надавацца вырашэнню надзённых праблем найменш абароненых катэгорый грамадзян: адзінокіх пенсіянераў, інвалідаў, шматдзетных сем'яў. У кожным раёне ўведзена ў практыку рэгулярнае наведванне дамоў і падворкаў камісіямі, у склад якіх уключаны як прадстаўнікі мясцовых органаў улады, так і ўсіх службаў раёна, каб на месцы комплексна вывучыць сітуацыю і аказаць рэальную дапамогу ў вырашэнні ўсіх праблем. У поўным аб'ёме выдзяляюцца сродкі на арганізацыю бясплатнага харчавання дзяцей у школах, размешчаных у раёнах, якія найбольш пацярпелі ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС, стабільна фінансуецца шэраг іншых сацыяльных праграм і г.д.

Уладзімір Дворнік упэўнены, што спатрэбіцца не так шмат часу, каб стабілізаваць фінансава-эканамічную сітуацыю ў краіне. Інструкцыя да дзеяння ёсць, праграма распрацавана, неабходна толькі жаданне добрасумленна працаваць.

«Мне заўсёды імпануюць людзі, якія не спрабуюць шукаць адказ на вечнае пытанне «Хто вінаваты?», а адразу, закасаўшы рукавы, пачынаюць выпраўляць становішча. Нашаму грамадству неабходна з'яднацца, каб сумеснымі намаганнямі за кароткі тэрмін пераадолець усе існуючыя цяжкасці. Няма сумнення ў тым, што мы годна выйдзем з гэтага крызісу і будзем далей паступальна развівацца», — падкрэсліў старшыня Гомельскага аблвыканкама.

**БЕЛТА.**

# КОДЭКС АБ АДУКАЦЫІ ЗАКЛАЎ ПАДМУРАК ДЛЯ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАВА

**1 верасня ўступіў у дзеянне Кодэкс Рэспублікі Беларусь, які парламентарыі, не без гонару, называюць Канстытуцыяй у адукацыі. Гэта цэласны дакумент, які рэгулюе абсалютна ўсе бакі адукацыйнага працэсу — ад дашкольнага выхавання да павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў. Фактычна замест пяцідзесяці нарматыўна-прававых дакументаў, якія былі прыняты за гады суверэнітэту Беларусі на ўзроўні Прэзідэнта ці на ўзроўні ўрада, у нас з'явіўся адзін дакумент. Прычым у Кодэксе знайшлі адлюстраванне таксама і тыя пытанні, якія раней, па розных прычынах, заставаліся па-за сферай рэгулявання.**

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.




Напрыклад, у Кодэксе ўпершыню ўводзіцца такое паняцце, як «адукацыйныя праграмы», якія падраздзяляюцца на адукацыйныя праграмы асноўнай, дадатковай і спецыяльнай адукацыі. Такі падыход забяспечыць рэалізацыю на практыцы прынцыпу акадэмічнай мабільнасці і будзе спрыяць пашырэнню студэнцкіх абменаў у рэчышчы прынцыпаў Балонскага працэсу. Упершыню заканадаўчае замацаванне атрымала сістэма дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, што раней называлася пазашкольным навучаннем і выхаваннем.

Усе грамадзяне, якія навучаюцца ў прафесійна-тэхнічных, сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных установах, з 1 верасня будуць заключаць з установай адукацыі дагаворы. Такія дагаворы будуць падпісваць усе першакурснікі дзённай, завочнай, бюджэтнай і платнай формы навучання. У Кодэксе прававое замацаванне атрымала таксама ідэя інтэграцыі сярэдняй спецыяльнай адукацыі з прафесійна-тэхнічнай і вышэйшай. А ўсе ўстановы сярэдняй спецыяльнай адукацыі цяпер перайменаваны ў каледжы. Тэрмін атрымання сярэдняй спецыяльнай адукацыі складае ад года да чатырох. Прафтэхадукацыю можна будзе атрымаць у тэрмін ад 6 месяцаў да 3 гадоў. Усяго прадугледжаны тры віды ўстаноў прафтэхадукацыі: прафтэхвучылішча, прафесійны ліцэй і прафесійна-тэхнічны каледж. Прыём на навучанне — без экзаменаў і без аплаты.

Істотным дасягненнем Кодэкса (трэба падкрэсліць, што гэта было зроблена ўпершыню на заканадаўчым узроўні) з'яўляецца рэгуляванне пытанняў дысцыплінарнай адказнасці ўдзельнікаў адукацыйнага працэсу. У заканатворчай практыцы ўпершыню вызначаецца такое паняцце, як «дысцыплінарны праступак». За здзяйсненне дысцыплінарнага праступка навучэнца могуць пакараць заўвагай, вымовай ці нават адлічэннем (праўда, адлічэнне пагражае толькі старшакласнікам, якім споўнілася 16 гадоў). Са школы могуць выключыць у выпадку, калі старшакласнік атрымае тры гадавыя адзнакі «0». Акрамя таго, калі вучань прапусціў на працягу навучальнага года больш як 30 дзён без уважлівай прычыны, таксама можа ставіцца пытанне аб яго адлічэнні са школы. У ВНУ пры выніковай атэстацыі станоўчымі будуць з'яўляцца адзнакі не ніжэй як «4» (чатыры) балы.

**За здзяйсненне дысцыплінарнага праступка навучэнца могуць пакараць заўвагай, вымовай ці нават адлічэннем (праўда, адлічэнне пагражае толькі старшакласнікам, якім споўнілася 16 гадоў). Са школы могуць выключыць у выпадку, калі старшакласнік атрымае тры гадавыя адзнакі «0».**

Падрабязна прапісаны ў Кодэксе правы і абавязкі студэнтаў, а таксама поўны пералік матэрыяльных заахвочванняў «мучанікаў навук». Пазбавіцца студэнцкага білета можна будзе за акадэмічную запазычанасць, няяўку на экзамен, спазненні і пропуск заняткаў без уважлівай прычыны, парушэнні дысцыпліны, распаўсюджванне інфармацыі, якая наносіць шкоду маральнаму і фізічнаму здароўю, невыкананне без уважлівых прычын законнага патрабавання педагагічнага работніка, знявагу ўдзельнікаў адукацыйнага працэсу, псаванне будынкаў, абсталявання і іншай маёмасці, курэнне ў будынках, інтэрнатах і на іншай тэрыторыі ўстаноў адукацыі, спажыванне алкагольных, слабаалкагольных напіткаў, піва, ужыванне наркатычных і псіхатропных рэчываў на тэрыторыі ўстаноў адукацыі або з'яўленне ў згаданых месцах у стане алкагольнага, наркатычнага ці таксічнага ап'янення.

Строга лімітавалі распрацоўшчыкі Кодэкса і магчымае аднаўленне студэнтаў ВНУ: калі раней з просьбай аб аднаўленні звярталіся нярэдка людзі, якія кінулі вучобу 10-15 гадоў таму, то цяпер прапісаны канкрэтны тэрмін — не больш як 3 гады пры ўмове навучання на першай ступені вышэйшай школы і два гады — пры атрыманні вышэйшай адукацыі на другой ступені.

Аднак ёсць і добрая навіна: для студэнтаў палепшыліся ўмовы атрымання акадэмічнага адпачынку. Апроч працяглых і частых хвароб і траўмаў, падставай для часовага (максімум год) адпачынку ад вучобы можа стаць зніжэнне працаздольнасці, а таксама любая іншая ўважлівая прычына па дамоўленасці з кіраўніцтвам ВНУ. Пасля заканчэння аспірантуры выпускнікам, якія паспяхова завяршылі курс навучання, але па нейкіх прычынах не змаглі абараніць кандыдацкую дысертацыю, будзе прысвойвацца кваліфікацыя «даследчыка». Такая кваліфікацыя будзе азначаць, што чалавек мае навыкі даследчай работы і можа праз нейкі час абараніць сваю тэму кандыдацкай. Аднак на гэтым этапе яму трэба працаўладкоўвацца. Кваліфікацыя «даследчыка» дазволіць яму разлічваць на рынку працы на асаблівыя пасады — праўда, для гэтага Міністэрства працы павінна знайсці нішу для спецыялістаў з такой кваліфікацыяй...

**Апроч працяглых і частых хваробаў і траўмаў падставай для часовага (максімум год) адпачынку ад вучобы можа стаць зніжэнне працаздольнасці, а таксама любая іншая ўважлівая прычын па дамоўленасці з кіраўніцтвам ВНУ.**

Згодна з Кодэксам аб адукацыі, педагагічныя работнікі маюць права на абарону свайго прафесійнага гонару, творчую ініцыятыву, свабоду выбару педагагічна абгрунтаваных формаў і метадаў навучання і выхавання, удзел у кіраванні ўстановай адукацыі, маральнае і матэрыяльнае заахвочванне за поспехі ў прафесійнай дзейнасці, а таксама на штомесячную кампенсацыю выдаткаў на набыццё вучэбнай і метадычнай літаратуры ў парадку і на ўмовах, што вызначаюцца ўрадам.

Разам з тым, узмацніліся і патрабаванні да педагогаў: педагагічныя работнікі абавязаны самі весці здаровы лад жыцця і прапагандаваць яго сярод сваіх выхаванцаў, павышаць свой прафесійны ўзровень і праходзіць атэстацыю, паважаць гонар і годнасць навучэнцаў і іншых удзельнікаў адукацыйнага працэсу, праходзіць медагляды не толькі пры паступленні на працу, але і рэгулярна падчас яе.

Упершыню ў Кодэксе заканадаўча замацавана падтрымка дзяцей, якія дасягнулі высокіх паказчыкаў у вучэбнай і грамадскай рабоце; дзяцей, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы; дзяцей, якім патрабуюцца асаблівыя ўмовы выхавання.

Такім чынам, Кодэкс ахоплівае прававымі нормамі абсалютна ўсю сістэму адукацыі: ён уключае 17 раздзелаў, 63 главы і 295 артыкулаў. Умовы для атрымання адукацыі створаны для ўсіх: для сельскіх і гарадскіх жыхароў, юных і пажылых, здаровых людзей і людзей з асаблівасцямі фізічнага і псіхічнага развіцця. У гэтым дакуменце захаваны ўсе лепшыя здабыткі беларускай адукацыі: дзяржаўная падтрымка, даступнасць, бясплатнасць, справядлівасць пры прыёме, стабільнасць функцыянавання з улікам сацыяльна-эканамічных умоў. Кодэкс аб адукацыі стаў першым дакументам такога роду ў свеце. Аналагічныя спробы рабіліся ў Францыі і Расійскай Федэрацыі, але ў Францыі прынялі толькі агульную частку дакумента. А ў Расіі і ўвогуле нічога не атрымалася...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Кватэрнае пытанне

# Адна сям'я распалася, другая з'явілася?

**Нас з мужам прынялі ў ЖБК на будаўніцтва двухпакаёвай кватэры. Аднак сям'я наша неўзабаве (і яшчэ да пачатку будаўніцтва дома) распалася. Цяпер я жыву ў аднапакаёвай кватэры сваёй маці. З намі таксама жыве бабуля...**

**Будаваць двухпакаёвую кватэру мне адной вельмі цяжка. Ці можна ў склад сям'і замест мужа ўключыць, напрыклад, бабулю і з разліку нарміруемай плошчы на двух чалавек атрымаць ільготны крэдыт?**

**Г. Свірко,** *г. Мінск.*

У адпаведнасці з заканадаўствам, у арганізацыі забудоўшчыкаў (ЖБК, ЖК), якія фарміруюцца па ініцыятыве мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, уключаюцца грамадзяне, якія стаяць на ўліку з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў, у адпаведнасці з чарговасцю пастаноўкі іх на такі ўлік

Ільготныя крэдыты на будаўніцтва жылых памяшканняў даюцца па спісах, складзеных у адпаведнасці з чарговасцю грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, і зацверджаным у вызначаным парадку адпаведным мясцовым выканаўчым і распарадчым органам.

У нашым выпадку мае месца змяненне складу сям'і члена сфарміраванага ЖБК да пачатку будаўніцтва жылога дома. Адпаведна, павінна быць перагледжана рашэнне аб прыёме сям'і ў члены арганізацыі забудоўшчыкаў і ўнесены адпаведныя змяненні ў спіс на выдзяленне льготных крэдытаў.

Для вырашэння пытання аб будаўніцтве двухпакаёвай кватэры ў складзе ЖБК на сям'ю з двух чалавек неабходна, каб з такім складам сям'і грамадзянін у вызначаным парадку быў прыняты ў кааператыў. Для разгляду гэтага пытання неабходна, перш за ўсё, каб бабуля разам з унучкай стаяла на ўліку асоб, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў як член яе сям'і.

У адпаведнасці з п. 2 Палажэння аб арганізацыях забудоўшчыкаў (зацверджана Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 28 студзеня 2008 г. № 43), да членаў сям'і члена арганізацыі забудоўшчыкаў аднесены: муж, жонка, дзеці, бацькі, іншыя родныя, сваякі, непрацаздольныя ўтрыманцы, якія пражываюць разам з членам арганізацыі забудоўшчыкаў, якія вядуць з ім агульную гаспадарку і заключылі пісьмовае пагадненне аб прызнанні іх членамі сям'і, а таксама іншыя грамадзяне, якія не менш за 5 гадоў пражываюць разам з членам арганізацыі забудоўшчыкаў, вядуць з ім агульную гаспадарку і прызнаны ў судовым парадку членамі яго сям'і.

**Віктар САВІЦКІ.**

Погляд

# «ВЫХАД НА АДЗІНЫ КУРС — ПРАВІЛЬНАЕ РАШЭННЕ»

**«Звязда» звярнулася да экспертаў з пытаннем, наколькі агучаныя на мінулым тыдні на нарадзе с Прэзідэнтам меры сапраўды дапамогуць нейкім чынам стабілізаваць сітуацыю:**

***Аляксандр ШВЕЦ, старшыня Беларускай навукова-прамысловай асацыяцыі:***

— Выхад з крызісу — гэта, безумоўна, добры крок. Ёсць такія крокі, неабходнасць якіх ужо даўно саспела, бо без іх мы нават не пачнём рух наперад: трэба зрабіць доступ да валюты больш ці менш афіцыйным. Каб, скажам, любое прадпрыемства магло выйсці на біржу, купіць валюту і адлюстраваць яе набыццё па тым курсе, па якім гэта зроблена. Таму словы, якія мы пачулі ад Прэзідэнта ў часткі арганізацыі дадатковай сесіі на валютнай біржы — гэта, я лічу, справа добрая. І калі яна будзе добра і дастаткова граматна рэалізавана, то гэта, вядома, будзе крокам да вырашэння праблемы выхаду з актыўнай фазы крызісу.

Якія ў бізнэсу ёсць асцярогі? Калі адкрыецца дадатковая сесія, то гэта, з майго пункту погляду, адразу паралельна пацягне за сабой закрыццё міжбанкаўскага рынку валюты: валюту можна будзе купіць або на асноўнай сесіі, або на дадатковай. Але на асноўнай, як мы чулі, будуць энерганосьбіты і іншыя асабліва важныя плацяжы, а ўвесь бізнэс (дзяржаўны і прыватны) будзе набываць валюту на дадатковай сесіі. Гэта значыць, што попыт і прапанова валюты на ёй павінны хоць бы прыблізна адпавядаць адно аднаму. І асцярогі могуць быць такога кшталту, што велічыня попыту на валюту можа істотна перавышаць велічыню прапановы, а гэта, калі мы гаворым пра рынавы курс, будзе штуршком да росту курсу долара ў дачыненні да рубля. І каб у такіх выпадках курс долара не задзіраўся высока, трэба, лічу, рабіць інтэрвенцыі. А наколькі ў Нацбанка хапае золатавалютных рэзерваў на гэтыя мэты — поўнай зразумеласці няма. Але мы спадзяёмся, што кіраўнікі Нацыянальнага банка і ўрада разумеюць, што грошай для падмацавання курсу павінна хапаць.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

Запрашаем на свята

# «ГЭТА ПАТРЭБНА БЫЛО ДЛЯ ЯГО ВАРТАСЦІ...»

**9-10 верасня ў Навагрудку пройдуць святочныя мерапрыемствы, прысвечаныя 500-годдзю атрымання горадам магдэбургскага права.**

У цэнтральнай раённай бібліятэцы 9 верасня ў 11 гадзін пачнецца навуковая канферэнцыя «Чалавек і ўлада» з удзелам знакамітых беларускіх гісторыкаў, супрацоўнікаў музейных устаноў, краязнаўцаў, плануецца таксама прыезд вучоных з Польшчы і Германіі.

Субота распачнецца знамянальнай для горада падзеяй — адкрыццём памятнага знака, прысвечанага 500-годдзю атрымання Навагрудкам магдэбургскага права.

У 12 гадзін — урачыстае адкрыццё свята на плошчы Леніна, пасля чаго адбудуцца выступленні калектываў Гродзенскай абласной філармоніі, самадзейных артыстаў Навагрудчыны і іншых раёнаў Гродзеншчыны.

На Малым Замку навагрудчан і гасцей горада парадуюць выставы рамеснікаў і народных умельцаў, а на пляцоўцы каля помніка Адаму Міцкевічу з 17 гадзін будуць выступаць камерныя калектывы.

Самых маленькіх наведвальнікаў свята сюрпрызы чакаюць у гарадскім парку: будуць ладзіцца атракцыёны, гульні, дзіцячыя канцэртна-забаўляльныя імпрэзы. А з 18 да 21 гадзіны тут будзе праходзіць канцэртна-забаўляльная праграма для моладзі.

Вечарам на плошчы Леніна пачнецца канцэрт Нацыянальнага акадэмічнага аркестра сімфанічнай і эстраднай музыкі Рэспублікі Беларусь пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга.

А ў 23.30 неба над горадам упрыгожыць святочны феерверк. Пасля яго да 4 гадзін раніцы можна патанчыць на начной дыскатэцы.

Непаўторную атмасферу старажытнага горада вы адчуеце, наведаўшы выставу старых фотаздымкаў «Ваяводскі Навагрудак», якая ладзіцца ў гісторыка-краязнаўчым музеі.

Спадзяёмся, што кожны, хто наведае Навагрудак у гэтыя святочныя дні, знойдзе для сябе нешта цікавае, будзе зачараваны нашым старажытным і такім прыгожым сёння горадам.

**Ірына ХОДАР, галоўны спецыяліст аддзела ідэалагічнай работы Навагрудскага райвыканкама.**

## ШТО ДАВАЛА НАВАГРУДКУ МАГДЭБУРГСКАЕ ПРАВА?

**Магдэбургскае права — гэта феадальнае гарадское права, якое склалася ў нямецкім горадзе Магдэбург у XII-XIII стагоддзях.**

З XIV ст. магдэбургскае права распаўсюдзілася і на гарады ВКЛ, што азначала ўключэнне іх у агульнаеўрапейскі кантэкст эканамічнага і грамадскага жыцця.

Паводле грамат на магдэбургскае (па-старабеларуску майдэборскае, майтборскае) права, у горадзе ствараліся органы самакіравання, незалежныя ад ваяводаў і старастаў. Гарадское кіраванне ўзначальваў войт, прызначаны вялікім князем. Разам з ім дзейнічала гарадская рада. Дзейнасць рады ў фінансавай сферы кантралявалася выбарным органам з мужоў паспалітых, або прысяглых. Існаваў уласны судовы орган па крымінальных справах — лава, куды ўваходзілі лаўнікі пад старшынствам войта. Штодзённымі справамі займаліся бурмістры, якія па сканчэнні паўнамоцтваў рабілі справаздачу перад радай, а пазней — на агульным сходзе гараджан. Бурмістарскі суд, куды ўваходзілі бурмістры з радцамі, разглядаў грамадзянскія справы. Гарадская рада і лава разам складалі магістрат. У судовай практыцы магістратаў Беларусі разам з магдэбургскім выкарыстоўваліся нормы агульнадзяржаўнага права — Статутаў ВКЛ.

Статус жыхароў істотна павышаўся: яны рабіліся вольнымі, набывалі права на зямельную ўласнасць, вызваляліся амаль ад усіх феадальных павіннасцяў (нарыхтоўкі сена, выдзялення фурманак і інш.), якія неслі дагэтуль разам з сялянамі воласці, ад суда і ўлады дзяржаўных службовых асоб. Дазвалялася будаваць у горадзе ратушу, мець крамы, мануфактуры, загадваць вагамі і мерамі, будаваць млыны, лазні і г. д. Прадугледжваліся і пэўныя гандлёвыя льготы.

Магдэбургскае права мелі каля 60 гарадоў і мястэчак Беларусі. Навагрудку яно было дадзена 26 ліпеня 1511 года на брэсцкім сейме (сёння гэты прывілей знаходзіцца ў Нацыянальным гістарычным музеі Літоўскай Рэспублікі ў Вільнюсе.). Тады горад лічыўся адным з асноўных у ВКЛ, з 1507 года стаў ваяводскім цэнтрам з добра развітымі рамёствамі.

Згодна з прывілеем, у Навагрудку ўсталёўвалася структура самакіравання, уводзіліся пасады войта, бурмістраў, радцаў і лаўнікаў. Гараджане вызваляліся ад вялікакняжацкай улады і падсуднасці, ім гарантаваліся эканамічная дзейнасць і ўласнасць.

Былі ў іх і пэўныя абавязкі. Плацілі падаткі, штогод давалі ў гарадскую казну 50 залатых, сярэбшчызну, плату з карчмы, рамесны дзейнасці, лавак. Кожную суботу паставлялі ў замак мяса, пры неабходнасці давалі падводы, выстаўлялі ахову.

З атрыманнем прывілея не спынілася ўздзеянне на горад дзяржаўнай улады. Многія акты вялікага князя павялічвалі ролю Навагрудка як эканамічнага цэнтра. Распараджэннямі вялікага князя мяшчане вызваляліся ад пэўных падаткаў, атрымлівалі дазвол на будаўніцтва прадпрыемстваў (напрыклад, цагельня, млын, васкабойня). З 1597 года дазвалялася двойчы ў год праводзіць кірмашы.

Асновай жыцця Навагрудка ў XVI стагоддзі былі рамёствы (налічвалася да 30 відаў вытворчасці) і гандаль. Штотыднёва ладзіліся кірмашы. З горада вывозіліся воск, футры, некаторыя рамесныя вырабы, а гараджане атрымлівалі сукно, соль і іншае. На кірмаш прыязджалі купцы з Вільні, Віцебска, Магілёва і іншых месцаў. Праязджаючы праз горад, іншагароднія плацілі пошліну.

У другой палове XVIII ст. многія беларускія гарады страцілі гэтае права. Аднак Навагрудку Канстытуцыя Варшаўскага сейма 1776 года яшчэ раз пацвердзіла магдэбургскае права, бо горад «ва ўсіх адносінах задавальняў справу вырашэння публічных судоў... І гэта патрэбна было для яго вартасці».

На Беларусі магдэбургскае права скасавана паводле ўказаў Кацярыны II. У заходняй Беларусі — у снежні 1795 года.

**Мікалай ГАЙБА, дырэктар Дома-музея Адама Міцкевіча ў Навагрудку.**

Ну і ну!

# У Мінску матацыкліст зарабіў адразу чатыры штрафы

**У Мінску матацыкліст паспрабаваў уцячы ад ДАІ і зарабіў адразу чатыры штрафы, паведамілі БЕЛТА ў АДАІ Фрунзенскага раёна сталіцы.**

Спачатку ён не спыніўся па патрабаванні інспектара дарожна-патрульнай службы на вуліцы Калеснікава. Яму ўдалося ўцячы ад машыны ДАІ дзякуючы высокай хуткасці, якую можа развіваць спартыўны матацыкл.

У той жа дзень матацыкліст зноў трапіў на вочы таму ж супрацоўніку дарожнай міліцыі. На гэты раз інспектар паспеў заскочыць на матацыкл, а затым затрымаць вадзіцеля і даставіць у падраздзяленне міліцыі. На матацыкліста было складзена адразу чатыры адміністрацыйныя пратаколы. Аказалася, што ён пазбаўлены вадзіцельскіх правоў, у яго няма страхоўкі. Акрамя таго, ліхач ехаў на матацыкле без нумароў. Яшчэ адзін штраф яму пагражае за тое, што не спыніўся па патрабаванні інспектара.

Больш за тое, у матацыкліста знайшлі пакецік з рэчывам, вельмі падобным на марыхуану. Цяпер праводзіцца яго аналіз. У крыві затрыманага выяўлены таксама сляды наркотыку: прыкладна за два дні да затрымання ён курыў марыхуану.

Падрабязнасці

# ПАХМЕЛЛЕ «П'ЯНАЙ РУСКАЙ ДЗЯЎЧЫНЫ»: пазбаўленне на 3 гады права кіравання аўтамабілем і тры штрафы

**Гераіня відэароліка «П'яная руская дзяўчына ў Беларусі (канфлікт з ДАІ)» на тры гады пазбаўлена права кіравання аўтамабілем і аплаціла тры штрафы — за дробнае хуліганства, за кіраванне без вадзіцельскага пасведчання і ў стане алкагольнага ап'янення. Аб гэтым БЕЛТА паведаміў начальнік аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Магілёўскага аблвыканкама Раман Посахаў.**

Паводле яго слоў, 2 верасня сталі вядомы вынікі хіміка-таксікалагічнага даследавання крыві жанчыны на колькасць этылавага спірту — 2,11 праміле. У панядзелак, 5 верасня, супрацоўнікі Касцюковіцкага РАУС склалі два пратаколы аб яе прыцягненні да адміністрацыйнай адказнасці. Першы — за кіраванне ў нецвярозым стане. За гэта парушэнне жанчына аплаціла Br1 млн 50 тыс. Другі — за кіраванне без вадзіцельскага пасведчання — штраф Br35 тыс. Як растлумачыў Раман Посахаў, на момант затрымання ў жанчыны не было правоў. Беларускія міліцыянеры звязаліся з расійскімі калегамі, якія паведамілі аб тым, што ёй было выдадзена расійскае вадзіцельскае пасведчанне. Паводле рашэння беларускіх праваахоўнікаў, яна пазбаўлена права кіравання на тры гады і ўнесена ў расійскую базу звестак грамадзян, пазбаўленых права кіравання аўтамабілем. Раней, 22 жніўня, жанчына была аштрафавана за дробнае хуліганства на суму Br70 тыс. Аплаціўшы штрафы, жанчына паехала ў Расію.

Ролік аб затрыманні супрацоўнікамі аддзялення ДАІ Касцюковіцкага РАУС п'янай жанчыны-вадзіцеля з'явіўся ў інтэрнэце ў канцы жніўня і на працягу некалькіх дзён быў адным з самых папулярных.

Пасля пісьма

# АКСАМІТКІ НЕ ЎЗЫШЛІ...

**Добры дзень, паважаная «Звязда»! Прабачайце, што непакою, але ж менавіта ў вас спадзяюся знайсці неабходнае мне разуменне і падтрымку, — пісала ў рэдакцыю Зінаіда Васільеўна Любецкая, в. Навасёлкі Бярэзінскага раёна. — А крыўда мая такая. У сваім райцэнтры (і не на вуліцы, не з рук — у краме) я купіла насенне кветак. Пасеяла іх і спадзявалася, што ўсё лета буду любавацца на свае клумбы. Ды дзе там! Вырасла пустазелле побач з маімі прыгожымі кветкамі. І гэта пры тым, што я столькі часу, столькі сіл патраціла, каб ускапаць зямельку, каб узрыхліць яе, каб не адзін раз прапалоць усходы. А мне ж ужо не 20 гадоў, а хутка 86. Я пенсіянерка, інвалід другой групы, раней працавала настаўніцай...**

**Вельмі хачу высветліць: чаму так атрымалася, хто мяне падвёў з насеннем? Можа, тады і ў іншых людзей на клумбах не вырасце пустазелле?**

Ліст шаноўнай чытачкі па просьбе рэдакцыі быў разгледжаны Бярэзінскім райвыканкамам. Як паведаміў намеснік яго старшыні спадар Навіцкі, на ўсё насенне, якім гандлюе прыватнае прадпрыемства «Мурравя», ёсць пасведчанні якасці, выдадзеныя спецыяльнымі лабараторыямі...

Але (даслоўна), згодна з Законам Рэспублікі Беларусь ад 9 студзеня 2002 года «Аб абароне правоў спажыўцоў», пры продажы спажыўцу няякаснага тавару прадавец абавязаны па выбары спажыўца замяніць няякасны тавар таварам належнай якасці альбо вярнуць грошы за няякасны тавар.

У выпадку, з якім звярнулася Зінаіда Васільеўна Любецкая, былі вернуты грошы.

Канфлікт, здавалася б, вычарпаны, можна паставіць кропку, «закрыць пытанне»: матэрыяльныя страты кампенсаваны... А што рабіць з маральнымі? Не малады, не здаровы чалавек капаў «зямельку» (так у лісце), для сябе і для іншых хацеў хараства...

Дык, можа, няхай яно будзе?! На тых самых клумбах!..

Аматары кветак, наколькі вядома, — людзі добрыя, шчодрыя. І цяпер якраз збіраюць насенне. То, магчыма, зробяць богаўгодную справу — падзеляцца з шаноўнай чытачкай?

А налета, калі будзе магчымасць, нехта з нашых фотакарэспандэнтаў дапаможа прапалоць, палюбавацца. І, магчыма, усім паказаць, што Ў НАС вырасла.

**ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов в агрогородке Драчково Драчковского сельсовета Смолевичского района Минской области**

| | | |
|---|---|---|
| 1 | Форма проведения аукциона | Открытый |
| 2 | Дата, время и место проведения аукциона | 19 октября 2011 года в 15.00, аг. Драчково, ул. Центральная, д. 19 «В», Драчковский сельисполком, кабинет председателя |
| 3 | Продавец и его адрес | Драчковский сельский исполнительный комитет, аг. Драчково, ул. Центральная, д. 19 «В» Смолевичского района Минской области |
| 4 | Земельный участок, его кадастровый номер и адрес | Лот № 1 — земельный участок площадью 0,1498 га (по генплану № 62) с кадастровым № 624880802101000504 в аг. Драчково, ул. Молодежная.<br>Лот № 2 — земельный участок площадью 0,1500 га (по генплану № 63) с кадастровым № 624880802101000505 в аг. Драчково, ул. Молодежная.<br>Лот № 3 — земельный участок площадью 0,1500 га (по генплану № 64) с кадастровым № 624880802101000508 в аг. Драчково, ул. Молодежная.<br>Лот № 4 — земельный участок площадью 0,1500 га (по генплану № 65) с кадастровым № 624880802101000506 в аг. Драчково, ул. Молодежная.<br>Лот № 5 — земельный участок площадью 0,1500 га (по генплану № 66) с кадастровым № 624880802101000507 в аг. Драчково, ул. Молодежная |
| 5 | Условия продажи | Без изменения целевого назначения |
| 6 | Целевое назначение земельного участка | Для строительства и обслуживания жилого дома |
| 7 | Начальная (стартовая) цена продажи | Лот № 1 — 27 812 600 рублей<br>Лот № 2 — 27 849 744 рублей<br>Лот № 3 — 27 849 744 рублей<br>Лот № 4 — 27 849 744 рублей<br>Лот № 5 — 27 849 744 рублей |
| 8 | Условия аукциона | А) продажа по цене не ниже начальной;<br>Б) участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории республики или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь |
| 9 | Наличие инженерной инфраструктуры | аг. Драчково — сети водопровода и газопровода находятся на расстоянии 300 м |
| 10 | Условия оплаты | За безналичный расчет в течение 5-ти рабочих дней после подписания протокола по результатам проведения аукциона |
| 11 | Сумма задатка и реквизиты продавца | 10% от начальной (стартовой) цены земельного участка, р/с 3604627010006 ЦБУ 621 г. Смолевичи, филиал 616 АСБ «Беларусбанк» г. Жодино код 812, УНП 600046589, назначение платежа 04002 (с пометкой «задаток за земельный участок») |
| 12 | Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемыми земельными участками | Каждую среду в 14.00 |
| 13 | Окончательный срок приема документов | 13 октября 2011 года в 17.00 |
| 14 | Контактные телефоны | 8 01776 48 4 23, 48 4 24, 48 4 73 |

**Расходы по организации и проведению аукциона** (лот № 1, № 2, № 3, № 4, № 5 — по 1 318 047 рублей за каждый), **затраты на публикацию информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона.**

Примечания: для участия в аукционе в адрес продавца необходимо предоставить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Копии платежных поручений, заверенные банком, подтверждающие внесение задатка на расчетный счет продавца.
3. Физическим лицам — документ, удостоверяющий личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица, и доверенность, заверенную нотариально (в случае, если интересы покупателя представляет это лицо).

# ХЛЕБ — У РАЦЫЁН!

Карысныя прадукты

**Навука аб харчаванні не пацвярджае адсутнасці карысных уласцівасцяў хлеба і хлебабулачных вырабаў. Апошнія застаюцца, бадай, адзіным прадуктам з унікальнымі ўласцівасцямі: не прыядаюцца, усім даступныя, пастаўляюць арганізму раслінныя бялкі, вугляводы, макра- і мікраэлементы. Дзякуючы хлебу чалавек амаль напалову задавольвае сваю патрэбу ў вугляводах, на трэць — у бялках, больш як напалову — у вітамінах групы В, солях фосфару і жалеза. Хлеб з пшанічнай ці жытняй мукі амаль цалкам задавальняе патрэбу ў харчовых валокнах.**

Як паведамляюць у Дэпартаменце па хлебапрадуктах Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання, зараз выпрабляецца звыш 400 найменняў хлебабулачных і каля 30 — кандытарскіх вырабаў. Гэта вырабы з паніжанай колькасцю вугляводаў, безглютэнавыя, узбагачаныя харчовымі валокнамі, вітамінамі, мікраэлементамі і г.д. Група дыетычных вырабаў у агульным аб'ёме хлебабулачных вырабаў вырасла за апошнія дзесяць гадоў з 1 да 30 працэнтаў.

Хлеб з грэцкімі крупамі ці мукой рэкамендуецца для лячэбна-прафілактычнага ўжывання тым, у каго ёсць сардэчна-сасудзістыя хваробы, парушаны абмен рэчываў. Хлеб з аўсянымі шматкамі ці мукой рэкамендуецца пры атэрасклерозе, атлусценні, хваробах печані, паніжанай функцыі кішэчніка. Вырабы, прызначаныя для харчавання дзяцей, спрыяюць умацаванню імуннага статусу і паляпшэнню фізічнага стану, а для асоб сталага веку — спрыяюць умацаванню сардэчна-сасудзістай сістэмы, кампенсуюць дэфіцыт кальцыю, селену, вітамінаў групы В.

Дзяржаўнае прадпрыемства «Белтэхнахлеб» распрацоўвае тэхналогіі новых відаў дыетычных хлебабулачных вырабаў з выкарыстаннем дабавак функцыянальнага прызначэння, якія карэктуюць вугляводны абмен. Дабаўкі функцыянальнага прызначэння будуць выраблены на аснове раслінай сыравіны з дабаўленнем інсуліну, бэта-глюкану, вітамінаў і іншых інгрэдыентаў. Вядуцца работы і па стварэнні новых відаў кандытарскіх вырабаў дыетычнага прызначэння і кандытарскіх вырабаў з паніжанай энергетычнай каштоўнасцю.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## Захапленне салодкім смяротна небяспечнае?

**Шведскія навукоўцы правялі даследаванне, падчас якога ўстанавілі, што рызыка развіцця раку маткі павышаецца ў жанчын, якія любяць перакусіць салодкім 2-3 разы на тыдзень, а ў тых, хто спажывае салодкае яшчэ часцей, рызыка развіцця анкалагічнага захворвання дасягае больш чым 42 працэнты.**

Спецыялісты патлумачылі, што цукар правакуе выкід інсуліну, які і стымулюе актыўны рост клетак слізістай абалонкі маткі. Акрамя таго, у жанчын павышаецца ўзровень эстрагену, таму рост клетак адбываецца бескантрольна, што з'яўляецца асноўнай характарыстыкай развіцця раку.

## Перакусваеш за камп'ютарам — памый рукі!

**Паверхня камп'ютарных сталоў у сотні разоў больш брудная, чым паверхня кухонных сталоў і ўнітазаў у прыбіральнях. Да такой высновы прыйшлі амерыканскія спецыялісты. Падчас даследавання высветлілася, што больш як 80 працэнтаў амерыканцаў прымаюць ежу, не адыходзячы ад стала з камп'ютарам. Высветлілася, што камп'ютарны стол і прадметы, што на ім знаходзяцца, з'яўляюцца рассаднікам хваробатворных бактэрый: іх колькасць у 100 разоў перавышае забруджанасць кухоннай паверхні і ў 400 разоў — паверхню ўнітаза ў прыбіральні.**

На думку даследчыкаў, праблема заключаецца ў тым, што людзі не звяртаюць увагу на гігіену і не мыюць рукі перад ядой, прычым ежу яны спажываюць, седзячы за камп'ютарам. Згодна з праведзеным апытаннем, толькі 36 працэнтаў рэспандэнтаў рэгулярна праціраюць рабочыя паверхні — стол, клавіятуру, камп'ютарную мыш. Астатнія ж робяць гэта, у лепшым выпадку, адзін раз у месяц.

Эксперты папярэджваюць, што разам з ежай, якая спажываецца непасрэдна на рабочым месцы, у арганізм трапляе вялікая колькасць мікраарганізмаў, якія могуць выклікаць небяспечныя захворванні.

## Інтэрнэт дапамагае аднавіцца падчас працоўнага дня

**Прагляд любімых інтэрнэт-старонак у працоўны час дазваляе расслабіцца і прыступіць да сваіх абавязкаў з новымі сіламі, сцвярджаюць даследчыкі з Нацыянальнага ўніверсітэта Сінгапура.**

Псіхолагі правялі маштабнае апытанне з мэтай высветліць, як заняткі, якія не адносяцца да непасрэднай работы, уплываюць на працаздольнасць работнікаў. Высветліся, што вэб-серфінг павышае прадуктыўнасць супрацоўніка, а вось прагляд электроннай пошты і перапіска, наадварот, вельмі адцягваюць увагу ад работы. Спецыялісты патлумачылі, што вэб-серфінг дапамагае супрацоўнікам маральна аднавіцца і папярэдзіць разумовае знясіленне, паколькі тыя наведваюць толькі цікавыя для іх сайты. У сваю чаргу, асабістая перапіска ў сацыяльных сетках негатыўна ўплывае на якасць работы.

Па гэтай прычыне псіхолагі рэкамендуюць працадаўцам будаваць рабочы працэс так, каб у іх падначаленых было крыху часу на асабістыя справы ў інтэрнэце.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Карысна ведаць

## РАБОТНІКІ ОФІСАЎ СТАМЛЯЮЦЦА ХУТЧЭЙ

**Несуцяшальныя навіны для работнікаў офісаў з адкрытай планіроўкай. Высветлілася, што такія ўмовы працы не толькі не эфектыўныя і зніжаюць прадукцыйнасць працы, але і пагаршаюць самаадчуванне работнікаў.**

Сумеснае даследаванне брытанскіх і амерыканскіх вучоных даказала: праца ў офісах «оўпенспэйс» ускладняецца пастаянным шумам і пабочнай мітуснёй, што можа панізіць яе эфектыўнасць на 15%, а таксама можа прывесці да дрэннага самаадчування супрацоўнікаў.

Нагадаем, што офісы з адкрытай планіроўкай (оўпенспэйс) былі распрацаваны ў 50-х гадах мінулага стагоддзя з той мэтай, каб людзі маглі свабодна і хутка перамяшчацца і кантактаваць адно з адным, што, у сваю чаргу, быццам бы садзейнічае развіццю творчага мыслення і дапамагае знайсці лепшае вырашэнне праблемы. Але, на думку навукоўцаў, рабочая атмасфера там далёкая ад дасканаласці. У такіх офісах чалавек знаходзіцца ў залішнім напружанні, што прыводзіць да дадатковай нагрузкі.

«Калі вы заняты якой-небудзь працай і раптам у калегі звоніць тэлефон, гэта адразу збівае вас з думкі і перашкаджае засяродзіцца. Нават калі вы не звяртаеце на званок ніякай увагі, мозг усё роўна на яго рэагуе», — расказваюць аўтары даследавання.

Акрамя таго, часта распаўсюджаная з'ява ў офісах — забарона размяшчэння на рабочым стале асабістых рэчаў, напрыклад, фотаздымкаў блізкіх, забавак ці кветак. Даследчыкі лічаць, што, калі б супрацоўнікам офіса дазвалялася «абагаціць» іх рабочую прастору сваімі асабістымі рэчамі, то яны сталі б лепш сябе адчуваць на 32% і павялічылі б сваю прадукцыйнасць на 15%.

Такая «хатняя» абстаноўка стварае камфортныя ўмовы і садзейнічае псіхалагічнай разгрузцы, што паляпшае канцэнтрацыю. Таму смела бярыце асабістыя рэчы і нясіце іх у офіс. І калі ваш шэф не хоча страціць каштоўнага работніка або знізіць прадукцыйнасць працы, то не пасмее сказаць вам і слова супраць.

**Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.**

## У КОЖНАГА ОФІСНАГА КЛЕРКА ПАВІННА БЫЦЬ СВАЯ ТЭРЫТОРЫЯ

**Брытанскія навукоўцы прыйшлі да высновы, што абстаноўка ў офісах з адкрытай планіроўкай перашкаджае супрацоўнікам выконваць пастаўленыя задачы. Ад пастаяннага шуму і немагчымасці застацца аднаму ў іх парушаецца дзейнасць галаўнога мозга і пагаршаецца канцэнтрацыя ўвагі. Акрамя таго, працоўнае месца, пазбаўленае хоць нейкай індывідуальнасці, зніжае прадукцыйнасць працы на 15 працэнтаў, паколькі стварае некамфортную абстаноўку.**

Першыя офісы з адкрытай планіроўкай з'явіліся ў 50-я гады мінулага стагоддзя. Яны былі прыдуманы для таго, каб супрацоўнікі маглі свабодна перасоўвацца па памяшканні і свабодна ўзаемадзейнічаць адно з адным, што тэарэтычна павінна было паспрыяць больш эфектыўнаму пошуку рабочых рашэнняў. Але высветлілася, што на самай справе ўсё адбываецца з дакладнасцю наадварот. Нават калі вы гэтага і не заўважаеце, мозг рэагуе на ўсе раздражняльнікі сканцэнтравацца вельмі праблематычна. Да таго ж працадаўцы часта забараняюць сваім падначаленым упрыгожваць сваё працоўнае месца і ўвогуле прыносіць у офіс асабістыя рэчы. Псіхолаг Крэйг Найт лічыць, што трэба дазволіць работнікам персаналізаваць сваё рабочае месца: «Падчас даследавання мы высветлілі, што супрацоўнікі больш эфектыўна працуюць у памяшканнях, дзе знаходзяцца фатаграфіі іх родных і хатнія расліны. І калі служачым дазволіць упрыгожыць сваё рабочае месца асабістымі рэчамі, гэта палепшыць іх самаадчуванне на 32 працэнты, а прадукцыйнасць працы — на 15 працэнтаў».

Летась Універсітэцкі каледж Лондана правёў апытанне каля дзвюх тысяч брытанцаў, якія працуюць у офісах, з мэтай даведацца, ці спадабаецца ім іх працоўнае месца. Больш паловы рэспандэнтаў (56 працэнтаў) паскардзіліся на адсутнасць асабістай тэрыторыі, 55 працэнтаў — на некамфортную тэмпературу ў офісе, а 60 працэнтаў — на недахоп цішыні. Кожны трэці быў незадаволены адсутнасцю ў офісе дзённага святла. Многія казалі, што офісы забітыя пад завязку, таму яны адчуваюць сябе, як у куратніку.

Між іншым, навукоўцы Тэхналагічнага ўніверсітэта Квінсленда ўстанавілі, што ад шуму і мітусні можа павышацца артэрыяльны ціск, што, у сваю чаргу, правакуе стрэсы, нервовае знясіленне і ўзмацняе падвержанасць вірусным захворванням.

**Падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.**

# НЕ ТАКІ, ЯК УСЕ

Дзіцячая тэма

## Дзіця часта крыўдзяць у школе. Што рабіць?

**РЭДКА ў каго дзяцінства праходзіць без канфліктаў у школьным калектыве. У класе дзіця набывае не толькі сяброў, але і непрыяцеляў. У любым калектыве заўсёды знойдзецца хуліган, які не супраць каго-небудзь пакрыўдзіць. Ён выбірае дзяцей са слабасцямі, высмейвае і крыўдзіць іх. А ў якасці слабасцяў выступаюць паўната, дрэнная фізічная падрыхтоўка або нізкая паспяховасць.**

Некаторыя дзеці не могуць стаць «сваімі» ў класе з-за частых хвароб, сарамлівага характару. Менавіта такія ранімыя, няўпэўненыя ў сабе «белыя вароны» і бываюць часцей за ўсё аб'ектамі для кпінаў — і часам не толькі хулігана, але і ўсяго класа.

Наступствы такога «цкавання» могуць быць самымі сумнымі: пачуццё адзіноты, крыўда на аднагодкаў, усведамленне сваёй непаўнавартасці.

### ПЕРШАЯ ДАПАМОГА

Уважлівай маме лёгка распазнаць, што дзіця крыўдзяць у школе. Яно вяртаецца ў слязах, падрапанае, ускудлачанае. У яго знікаюць асабістыя рэчы (ручкі, гумкі). Яно нічога не расказвае, але ходзіць прыгнечанае. Бывае і такое: малы робіць выгляд, што захварэў, каб не ісці ў школу. Усе гэтыя прыкметы патрабуюць размовы па душах. Пастарайцеся стаць дзіцяці добрым дарадчыкам, пакажыце, што вы заўсёды гатовы выслухаць яго.

Папрасіце малога расказаць, што адбываецца і што ён думае пра гэта. Але не лезьце ў душу і не чапляйцеся. Няхай ён сам вырашыць, ці гатовы падзяліцца з вамі сваёй бядой.

Скажыце, што з вамі таксама такое здаралася: прыгадайце свае школьныя канфлікты, як вы выходзілі з такіх сітуацый.

Часам па расказе дзіцяці відаць, што яно і само вінаватае ў тым, што здарылася. Патлумачце, што яно было не на вышыні, а аднакласнікі, пэўна, таксама адчуваюць крыўду.

Падумайце разам, як вы можаце вырашыць канфлікт? Можа, дзіця дражняць за тое, што яно не модна апранута? Тады займіцеся знешнім выглядам. Неспартыўнае? Падбярыце падыходзячую секцыю. Дэфекты мовы дапаможа выправіць лагапед.

Вырашыце, чым можна здзівіць і зацікавіць аднакласнікаў. Напэўна, штосьці ваша дзіця робіць лепш за іншых: цудоўна малюе, шмат чытае. Дапамажыце ў вучобе. Падтрымлівайце, падбадзёрвайце і ўсяляйце ўпэўненасць.

### ВІЗІТ У ШКОЛУ

Некаторым бацькам здаецца, што самы неабходны парыў — прыйсці ў школу, пагаварыць з настаўнікам (а часам і з завучам, і з дырэктарам). А ў выніку пакутуе зноў жа дзіця. У класе яму аб'яўляюць байкот, называюць «даносчыкам», не хочуць кантактаваць і сябраваць. Ці вытрымае яно такое выпрабаванне маўчаннем?

Настаўнікі таксама пачнуць па-асабліваму ставіцца да яго — будуць баяцца лішні раз зрабіць заўвагу. Таму пастарайцеся па магчымасці абысціся без візіту ў школу. Але калі пад пагрозай бяспека дзіцяці, пагаварыць з настаўнікам неабходна. Прытрымлівайцеся некаторых правіл:

- спытайце ў малога, ці згодны ён, каб вы абмеркавалі праблему з выкладчыкам. Калі дзіця чакае, каб вы яго абаранілі, ідзіце насустрач;
- дамоўцеся з настаўнікам, каб аднакласнікі малога не даведаліся пра вашу размову;
- ні ў якім разе не абвінавачвайце педагога ў «няўважлівасці» і «бяздзейнасці», будзьце далікатнымі. Не ідзіце на повадзе ў сваіх эмоцый. Безумоўна, вы расхваляваныя, але пастарайцеся знайсці кантакт з выкладчыкам, абмяркуйце сумесныя дзеянні, зыходзячы з канкрэтных фактаў.

### НЕПРЫСТОЙНЫЯ СЛОВЫ

Дзіця нахапалася непрыстойных слоў у садку і цяпер лаецца не горш за п'янага шаўца. Як адвучыць яго?

Сварыцца, сарамаціць і караць малога ў такіх выпадках не трэба, паколькі ён яшчэ не ведае значэння гэтых слоў, не разумее, што гэта дрэнна, а таму ваша пакаранне здасца яму несправядлівым.

Лепшы спосаб уздзеяння — тлумачэнне. Пастарайцеся зрабіць так, каб малы зразумеў, што выкарыстоўваць брыдкія словы сорамна і непрыстойна. Пры гэтым ваш тон павінен быць спакойным і дабрадушным, ні ў якім выпадку не раздражнёным.

Калі ж вы пакажаце, што шакіраваны і абураны, дзіця можа паўтарыць гэтыя словы знарок, каб падражніць вас. Таму ласкавае абыходжанне будзе нечаканым для дзіцяці і толькі зменшыць яго жаданне вас пазлаваць.

У некаторых бацькоў брыдкія словы, вымаўленыя карапузам, выклікаюць міжвольны смех. Пастарайцеся стрымаць свае эмоцыі: малы можа ўспрыняць смех як знак ухвалення і будзе старацца выклікаць весялосць зноў і зноў.

**Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.**

# SPA-БОРНІЦТВА НА «МІНСК-АРЭНЕ»

**У мінулую суботу ў памяшканні веладрома культурна-спартыўнага комплекса «Мінск-Арэна» прайшоў першы чэмпіянат Беларусі па SPA-масажу. Удзел у ім узялі 22 майстры.**

Такога раней у нас не было. Упершыню ў адным месцы сабраліся лепшыя айчынныя масажысты краіны, каб прадэманстраваць сваё ўменне і паспаборнічаць за перамогу ў прафесійным конкурсе.

Мерапрыемства не засталося незаўважаным, і гэта цалкам зразумела: папулярнасць SPA-паслуг у рэспубліцы расце, а адпаведна — і патрабаванні да прафесійнага ўзроўню масажыстаў, якім сёння неабходна, апроч класічных практык, асвойваць старажытныя, экзатычныя, нацыянальныя і заходнія тэхналогіі. Між іншым, у Маскве ўжо чатыры гады ладзіцца міжнародны прафільны чэмпіянат, які праходзіць у рамках выставы «Інтэршарм». Наша краіна да апошняга часу заставалася ў баку ад яго, аднак цяпер усё змянілася. Беларускі чэмпіянат па SPA-масажу стане адборачным да чэмпіянату свету.

**Іна АРЭХАВА.**

Фота БЕЛТА.



# ПРАВІЛЫ БЯСПЕКІ Ў ВАННАЙ

Май на ўвазе!

**Ванны пакой — адно з найважнейшых памяшканняў у доме — нярэдка становіцца крыніцай небяспекі. Пакой, пакрыты кафляй, можа падарваць здароўе з трох бакоў: тут можна атрымаць фізічную траўму, хімічнае атручэнне або нават хранічнае захворванне.**

**Але гэта не прычына, каб адмовіцца ад гігіены. Зрабіць пакой менш «шкодным» не так ужо і складана.**

### Фізічная пагроза

Як правіла, падлога ваннага пакоя пакрыта кафляй. Яна пры трапанні вады ператвараецца ў каток. Па традыцыі, сама ванна эмаліраваная. Гэтае пакрыццё выглядае вельмі эфектна, яно не сціраецца на працягу 30 гадоў і ўсе гэтыя гады застаецца надзвычай слізкім (нават калі яно сухое). Усё гэта стварае ідэальныя ўмовы для таго, каб упасці і атрымаць шматлікія траўмы, пераломы і страсенні. Асабліва слізкія паверхні небяспечныя для:

- ❒ дзяцей да 5 гадоў. Па-першае, малыя яшчэ вельмі дрэнна кантралююць раўнавагу, а па-другое, у іх пакуль не развіты інстынкт самазахавання, і, падаючы, яны нават не паспрабуюць ухапіцца за што-небудзь;
- ❒ жанчын пасля 50—55 гадоў. Узроставыя і гарманальныя змены ў жаночым арганізме, уласцівыя гэтаму перыяду, робяць косці надзвычай крохкімі. Пасля паўвекавога юбілею лёгка атрымаць пералом нават пры нязначным удары, асабліва часта ломіцца шыйка сцягна — ад прыроды гэта надзвычай далікатнае месца. Такая траўма вельмі непрыемная: косць доўга не зрастаецца і існуе рызыка, што пасля выздараўлення адна нага застанецца карацейшай за другую.

**Што рабіць?**

Каб зрабіць ванну і падлогу ў ёй больш устойлівымі, патрэбны адмысловыя дыванкі, якія можна слаць не толькі на падлогу, але і ў самую ванну. Для гэтага ёсць дыванкі, забяспечаныя прысоскамі, якія цвёрда фіксуюць іх становішча. Не падабаецца дыванок — прымацуйце да дна ванны супрацьслізготную аплікацыю. Толькі трэба памятаць, што такія дыванкі абавязкова павінны быць на прагумаванай аснове, інакш у іх хутка паселяцца розныя мікраарганізмы.

Акрамя таго, паверхню самой ванны можна пакрыць акрылам — гэта павялічыць яе даўгавечнасць і ліквідуе ўсякае слізгаценне.

Калі вы вырашылі памяняць падлогу ў ванным пакоі, не спакушайцеся халоднай прыгажосцю глянцавай кафлі — гэта самы «слізкі тып» пакрыцця. Аддайце перавагу матаваму керама-граніту. На ім вельмі цяжка страціць раўнавагу, нават калі ён намакае. Гэты матэрыял лічыцца адным з самых экалагічна чыстых, пераўзыходзіць прыродны камень па трываласці і, у адрозненне ад некаторых відаў аздаблення, з часам не становіцца радыеактыўным.

### Хімічная пагроза

Звычайна ванны пакой — невялікі па плошчы і, як правіла, дрэнна вентылюецца. У сувязі з гэтым выкарыстанне і захоўванне ў ім хімічных чысцячых рэчываў прыводзіць да таго, што атмасфера пакойчыка хутка напаўняецца шкоднымі таксічнымі рэчывамі. А яны не толькі правакуюць атручэнне, але і могуць назапашвацца ў нашым арганізме, прыводзячы да анкалагічных і хранічных захворванняў.

**Што рабіць?**

Каб мінімізаваць шкоду чысцячых сродкаў — не купляйце тое, што валодае моцным пахам, змяшчае агрэсіўныя растваральнікі, хлор і аміяк.

Сачыце, каб на ўпакоўцы сродку быў надпіс «нетаксічна».

Падчас прыбірання можна надзець рэспіратарную маску, а пасля праветрыць памяшканне.

Дарэчы, пагрозу для здароўя ствараюць не толькі сродкі для чысткі, але і... звычайныя шторкі, а таксама асвяжальнікі паветра. Небяспеку ўяўляюць занавескі з ПВХ. Гэтае злучэнне выдзяляе ў паветра лятучыя арганічныя рэчывы, якія адмоўна ўздзейнічаюць на нервовую сістэму і могуць выклікаць анкалагічныя захворванні.

Лепш замяніць такія занавескі на больш экалагічныя.

У складзе ненатуральных асвяжальнікаў паветра і аэразоляў ёсць рэчывы, якія раздражняюць тканкі лёгкіх, правакуюць галаўны боль і прытупляюць нюх. Лепш адмовіцца ад іх, замяніўшы на кветкі або араматычныя свечкі.

### Біялагічная пагроза

У ванным пакоі існуюць ідэальныя ўмовы для росту і развіцця грыбка і цвілі. Адсутнасць нармальнай вентыляцыі, старыя трубы і высокая вільготнасць прыводзяць да таго, што ў вас заводзяцца нечаканыя суседзі. Існуе больш як 100 000 відаў грыбкоў, якія могуць існаваць у ваннай. Часцей за астатніх там селіцца аспергіла чорная (Aspergillus niger). Калі ў вашым ванным пакоі ёсць чорны налёт — значыць, вы знаёмыя з гэтым відам не па чутках.

Грыбкі страшныя не толькі з эстэтычнага пункту гледжання. Небяспеку для нашага здароўя ўяўляе не сама цвіль, а мільёны спор, якія яна выдзяляе ў навакольную прастору. Мы ўдыхаем іх разам з паветрам — так яны аказваюцца ў дыхальнай і крывяноснай сістэме. Здаровая імунная сістэма паспяхова супрацьстаіць ім. Калі ж імунітэт аслаблены, то чорная цвіль можа выклікаць бранхіяльную астму, алергічны сінусіт, бронхалёгачны аспергілёз (нярэдка прыводзіць да лятальнага зыходу) і іншыя захворванні. Да ўздзеяння прадуктаў жыццядзейнасці цвілі найбольш схільныя алергікі, дзеці і старыя.

**Што рабіць?**

Грыбок неабходна выдаляць. Каб ліквідаваць ворага цалкам, неабходны рамонт, падчас якога прафесіяналы апрацуюць памяшканне спецыяльным прэпаратам.

Калі рамонт пакуль у вашы планы не ўваходзіць, трэба апрацоўваць пашкоджаныя паверхні гарачым моцным растворам соды і пральнага парашку (лыжка парашку, пачак соды на вядро вады). Гэты склад стварае шчолачнае асяроддзе, ад якой грыбок гіне. На жаль, споры, якія ён паспявае выдзеліць перад смерцю, могуць схавацца глыбока пад кафлю, і праз нейкі час цвіль адродзіцца. Каб гэтага не здарылася, апрацоўку праводзяць раз у 1—2 месяцы (або пры першым з'яўленні грыбкоў).

**Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.**


**ПОСТАВСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ**
**(211875, Витебская обл., г. Поставы, пл. Ленина, 25)**
**13 сентября 2011 года в 10.00**

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

**на право заключения договора аренды сроком на 25 лет земельного участка с кадастровым номером 224081816601000244 площадью 0,0734 га для строительства и обслуживания здания отделения банка по адресу: аг. Камаи, ул. Гагарина, 6 Поставского района Витебской области.**

Аукцион проводится в здании райисполкома (г. Поставы, пл. Ленина, 25) в кабинете заместителя председателя райисполкома по экономике (III этаж, каб. 58).

**Начальная цена предмета аукциона 1 500 000 (один миллион пятьсот тысяч) белорусских рублей.**

Победитель аукциона обязан в 10-дневный срок со дня принятия райисполкомом решения о предоставлении земельного участка в аренду:

- внести в местный бюджет плату за право заключения договора аренды земельного участка в размере, заявленном на торгах;
- возместить организатору аукциона (Поставскому райисполкому) расходы, связанные с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка в сумме **2 834 116 белорусских рублей**;
- заключить с Камайским сельсоветом от имени Поставского райисполкома договор аренды земельного участка и осуществить в двухмесячный срок после получения решения о предоставлении земельного участка в аренду государственную регистрацию возникновения права на земельный участок;
- приступить к занятию земельного участка по целевому назначению не позднее 6-ти месяцев со дня получения свидетельства о государственной регистрации.

По вопросам получения дополнительной информации о земельном участке, ознакомления с земельно-кадастровой документацией, подачи заявления на участие в аукционе обращаться в землеустроительную службу Поставского райисполкома по адресу: **г. Поставы, пл. Ленина, 25, здание райисполкома, 1-й этаж, каб. № 11, контактный телефон 8 (02155) 43180.**

Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00 со дня публикации настоящего объявления **до 9 сентября 2011 года включительно.**

К заявлению на участие в аукционе прилагаются:

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

При подаче документов на участие в аукционе представители юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию в указанные в извещении сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке задаток.

**Размер задатка – 150 000 белорусских рублей.**

Реквизиты получателя платежа для перечисления денежных средств (задатка за участие в аукционе) – Камайский сельсовет, счет № 3600324050003 в ЦБУ № 230 филиала № 216 ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Полоцке, код банка 150801648, код платежа 4901).



**ОБЪЯВЛЕНИЕ**

**16 СЕНТЯБРЯ 2011 ГОДА СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**

**ОАО «КАМВОЛЬ»**

Собрание пройдет по месту расположения Общества: г. Минск, ул. Маяковского, 176, конференц-зал, 4-й этаж главного корпуса.

**ПОВЕСТКА ДНЯ**

**1. О даче согласия на увеличение уставного фонда Общества.**

**2. О создании совместного предприятия по производству упаковки.**

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Маяковского, 176, ком. 204, тел.: 223 17 02, 3 15.

Регистрация участников собрания с 14.00 до 14.45.

**Начало работы собрания — 15.00.**

Список акционеров для участия в собрании составлен по состоянию реестра на 07.09.2011 г.

Для регистрации при себе иметь паспорт.

УНП 100074393.



**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА**

| № лота | 1. |
|---|---|
| Предмет аукциона (месторасположение земельного участка, адрес, кадастровый номер) | Земельный участок, расположенный по адресу: Гродненская область, Орлевский сельсовет, д. Дворчаны, 17А, кадастровый номер 425885302605000011 |
| Площадь, га | 0,1500 |
| Срок аренды | 50 лет |
| Цель | Строительство и обслуживание жилого дома |
| Характеристика земельного участка (инженерная инфраструктура, наличие ограничений в использовании) | Ограничения в использовании по перечню № 4.1 – водоохранная зона водного объекта на площади 0,1500 га и по перечню № 13.2 – охранная зона линии электропередач напряжением до 1000 вольт на площади 0,0030 га. Существует возможность подключения к газопроводу и электроснабжению |
| Начальная цена предмета аукциона, руб. | 284 348 |
| Сумма задатка, руб. | 28 435 |

1. Аукцион состоится **7 октября 2011 г. в 11.00** по адресу: 231513, аг. Орля, ул. Советская, 11 (здание Орлевского сельсовета, кабинет председателя сельсовета).

Заключительная регистрация участников аукциона **7 октября 2011 г. с 8.30 до 10.30.**

2. Организатор аукциона – Орлевский сельский исполнительный комитет (далее – сельисполком), аг. Орля, ул. Советская, 11; контактные телефоны комиссии: председатель (8 01514) 38341, заместитель председателя (8 01514) 27064, секретарь (8 01514) 33372.

3. Прием заявлений и прилагаемых документов на участие в аукционе производится **с 6 сентября 2011 г. по 4 октября 2011 г. включительно** с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00, кабинет управляющего делами сельисполкома.

4. Для участия в аукционе гражданин в установленный в извещении о проведении аукциона срок подает заявление на участие в аукционе с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка, который предполагается получить в аренду по результатам аукциона, а также копию квитанции о внесении задатка.

Кроме того, в комиссию или организацию гражданином представляется копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования.

При подаче документов на участие в аукционе граждане предъявляют документ, удостоверяющий личность.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию или организацию в указанные в извещении сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие задаток в размере, порядке и сроки, определенные в извещении о проведении аукциона.

5. Сумма задатка перечисляется на расчетный счет организатора аукциона № 3600527100154 ЦБУ филиала № 400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Щучин, код 752, получатель Орлевский сельский исполнительный комитет, УНП 500000150.

6. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками. Предмет аукциона не может быть продан по начальной цене.

7. Победитель аукциона обязан: подписать протокол аукциона;

в течение 10 рабочих дней после принятия решения сельисполкома о предоставлении ему земельного участка: внести плату за право заключения договора аренды; возместить затраты за проектно-изыскательские землеустроительные работы, за государственную регистрацию; возместить расходы по размещению извещения о проведении аукциона в СМИ.

8. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи.

На свае вочы

# ПАРЫЖ, ЯКІ НІКОЛІ НЕ КАНЧАЕЦЦА

Святлана ЯСКЕВІЧ

**КАЛІ вы едзеце ў Парыж на дзень-другі ў чаканні цуду ад знаёмства з горадам Хемінгуэя, мастакоў-імпрэсіяністаў, едзеце, каб адчуць душой гэты асаблівы горад, — вы рызыкуеце сутыкнуцца з вялікім расчараваннем. Упершыню мы адчулі яго тады, калі наш экскурсійны аўтобус уехаў на адну з усходніх ускраін Парыжа. Проста жах ахапіў ад таго, што на вуліцах шмат смецця, вакол кантэйнераў валяюцца горы бруду. А ўздоўж вуліц цягнуцца агароднінна-фруктовыя гандлёвыя рады. Любы наш райцэнтр у сто разоў чысцейшы, а тут быццам нейкі Шанхай даваенный пары. І справа не ў бяздзейнасці камунальных службаў мегаполіса, а ў дэмаграфічнай сітуацыі Еўропы. Насельнікі гэтых ускраін, гандляры такіх не характэрных для асноўнага горада рынкаў — выхадцы з краін Азіі і Афрыкі. Трэба думаць, нас чакае тое самае, калі дэмаграфічная свядомасць наша не зменіцца... Але гэта так, да слова.**

## У ПОШУКАХ ПАРЫЖА

На шчасце, гэтыя нягеглыя пейзажы хутка канчаюцца, калі рухаешся далей у глыб горада. Варта дадаць, што і некаторыя турысты паводзяць сябе не лепш за насельнікаў ускраін. На востраве Сітэ, у самым сэрцы Парыжа, давялося назіраць сцэну, якая падалася мне надзвычай шчымлівай і красамоўнай. У гістарычнай частцы горада, ды яшчэ ў выхадны дзень, экскурсійныя групы з усяго свету рухаюцца бясконцым патокам. Вось і мы ў іх шэрагах з вялікай цікавасцю разглядалі прыгожыя гмахі будынкаў, узведзеныя Людовікамі, дзівіліся на масты цераз Сену, пабудаваныя ў розныя эпохі. І на адным з мастоў кідалася ў вочы свежая кучка пакетаў, скамечаных сурвэтак, пластыкавых бутэлек, якую абыякава абміналі турысты. Насустрач ішла пажылая парыжанка з заплечнікам. Спачатку яна таксама прайшла, потым вярнулася, пазбірала пазадкі чужога бескультур'я і кінула ў смецніцу, якіх на вуліцы шмат.

Сапраўдныя парыжане любяць свой горад — пра гэта скажам пазней. А пакуль мы, як і ўсе турысты, спяшаліся за адведзены час ахапіць больш вачыма і душой. Пра Парыж столькі напісана, знята стужак, размешчана інфармацыі ў інтэрнэце, што не варта пералічваць яго асноўныя славутасці, тым больш што іх вельмі многа. Вядома, кожнаму, хто трапляе ў гістарычны цэнтр горада, карціць паглядзець на сабор Парыжскай Божай Маці. Была нядзеля, у храме ішла служба, але турысты маглі свабодна прагульвацца пад змрочнымі і велічнымі скляпеннямі Нотр-Дама. Ахвотныя, у тым ліку і мы з сяброўкай, паставілі свечкі ў старажытным саборы. Мне спадабалася сістэма: не трэба стаяць у чарзе і купляць тую свечку. Яны размешчаны на спецыяльным прыстасаванні ледзь не на кожным кроку. Побач стаяць скрынкі, куды трэба кінуць 2 еўра. Калі ў цябе няма грошай, ты можаш запаліць свечку так, ніхто цябе не кантралюе: ты ж у боскім храме, а не ў краме.

Наогул сабор Парыжскай Божай Маці вельмі вялікі, за 10 хвілін яго цяжка абысці па перыметры, калі рухаешся не хуткім крокам, а звяртаеш увагу на асаблівасці архітэктурнага вырашэння, на мастацкія магчымасці старажытных майстроў, апісаныя ў творах Гюго. У Парыжы ўражваюць не столькі самі помнікі архітэктуры, дамы, палацы, колькі магчымасць паглядзець на знаёмыя з літаратуры рэчы. Вось пляц, дзе стаяла гільяціна для Марыі Антуанеты; вось будынкі, узведзеныя кардыналам Рышэльё; далей — самы стары мост горада (ён, як ні дзіўна, называецца Новым), дамы і палацы, звязаныя з імем Напалеона Банапарта, якога парыжане любяць і шануюць. У Парыжы вам абавязкова пакажуць ваеннае вучылішча, якое скончыў будучы імператар. І хоць палітыкам Банапарт быў, як вядома, неадназначным, часам даволі жорсткім, тут найбольш акцэнтуюць увагу на тым добрым, што ён зрабіў для Францыі. Напрыклад, Дзяржаўны Дом інвалідаў, які быў узведзены яшчэ Людовікам XIV, імператар зрабіў установай сацыяльнага тыпу. Нешта накшталт інтэрната, дзе людзі маглі жыць да канца сваіх дзён, атрымлівалі харчаванне і медыцынскую дапамогу. Правілы ў Доме інвалідаў былі даволі строгія. Так, кожны насельнік за абедам штодня атрымліваў 400 грамаў віна. А хто дазваляў сабе больш, рызыкаваў пазбавіцца месца. У наш час дом належыць міністэрству абароны. Там размяшчаюцца музей і ваенны шпіталь. Кажуць, што ў шпіталі працуюць самыя высакакласныя медыкі французскай сталіцы, а трапіць туды, калі ты не маеш адносін да войска, немагчыма. Але ў апошнім няма вялікай патрэбы. Медыцына Францыі лічыцца адной з лепшых ва ўсім Еўрасаюзе, аб чым красамоўна сведчыць самая высокая працягласць жыцця грамадзян. Што датычыць адукацыі, то і сярэдняя, і вышэйшая адукацыя ў Францыі бясплатныя. Паступіць у Сарбону, напрыклад, маюць шанц нават замежныя абітурыенты і ў выпадку, калі яны пакажуць адпаведны ўзровень на іспытах, то залічваюцца на такіх жа ўмовах, як грамадзяне сваёй краіны.

Парыж жа гандлёва-прамыслова-дзелавы, паводле слоў тых, хто бываў у Нью-Ёрку, нагадвае Манхэтэн. Сапраўды, высозныя офісныя гмахі са шкла і бетону падобныя на тое, што даводзілася бачыць па тэлевізары з Амерыкі. У дзелавой частцы — а начаваць нам давялося менавіта там — вельмі прыемная сучасная архітэктура, бездакорная чысціня. І разам з тым, што забудаваны, падаецца, кожны квадратны метр, знайшлося месца для зялёных насаджэнняў. Так, сёння Парыж — сучасны еўрапейскі мегаполіс, які будуецца вельмі прадумана. Падземныя тунэлі, што злучаюць розныя часткі горада, цягнуцца на некалькі кіламетраў і значна разгружаюць наземныя трасы.


Ля канцылярыі федэральнага канцлера ў Берліне.

І хоць, несумненна, мяне ўразіў Парыж часоў сярэднявечча, цікава было паглядзець на дзелавую частку горада, а з вышыні Эйфелевай вежы Парыж здаецца зусім не падобным да іншых гарадоў. Я ўсё шукала і не знаходзіла свой Парыж, той асаблівы Парыж, сустрэчы з якім я чакала не без уплыву Хемінгуэя ды іншых аўтараў... І нечакана знайшла яго не ў Луўры, не на Елісейскіх палях альбо ў Лацінскім квартале, а на адной з набярэжных Сены, аглядаючы яе са звычайнага турысцкага караблік, прагулку на якім прапануюць усім ахвотным. Тэмпература ў той дзень дасягала 34 градусаў цяпла. І на той частцы набярэжнай, якая была «апранута» ў камень, магчыма, яшчэ ў пазамінулым стагоддзі адпачывалі гараджане, у большасці моладзь. Па адным, па двое, групкамі людзі бестурботна ўладкоўваліся на беразе Сены: адны сядзелі, другія ляжалі, прымасціўшы пад галаву сумку і паставіўшы побач бутэльку з вадой. Многія шчыра ўсміхаліся і прыветна махалі рукамі ў бок пасажыраў нашага карабліка. І было нешта ўрачыста-святочнае ў гэтых сучасных людзях, што ляжалі ўздоўж сцен, узведзеных Людовікамі, і разам з тым, простае і блізкае. Потым гэтае адчуванне паўтарылася, калі давялося акінуць вокам гараджан, што сядзелі з кубкам кавы, з келіхам віна альбо піва ў вулічных кавярнях на Елісейскіх палях. Найчасцей у Парыжы сядзяць усё ж з кавай. Падалося тады, што найбольшая загадка Парыжа — у яго жыхарах. Мабыць, яны ведаюць нешта такое, што не адразу адкрываецца несвядомаму турысту. Тое, што Хемінгуэй вызначыў выразам: «Парыж ніколі не канчаецца», і далей: «...Мы заўсёды вярталіся туды... Парыж варты таго, і ты заўсёды атрымліваў спаўна за ўсё, што аддаваў яму». І гэта праўда, нават калі на гэтыя ўзнёслыя словы спрацэцыраваць банальны кошт пуцёўкі, якую трэба купіць, каб паехаць у Еўропу. І калі давялося ўсяго толькі дзень-другі правесці ў гэтым цікавым горадзе, то пакідаеш яго з вялікім жаданнем прыехаць сюды калі-небудзь зноў.


Ля аднаго з будынкаў Луўра.

## ВАРШАВА І БЕРЛІН

Да Парыжа я вярнуся яшчэ неаднойчы ў сваіх сціплых нататках, але мушу сказаць колькі слоў пра іншыя гарады, у якіх давялося пабыць падчас шасцідзённага падарожжа па Еўропе. І першай была Варшава, бо яна — адразу за Брэстам. Нейкія 150 кіламетраў — і ты ў сталіцы Польшчы. Хто не быў у той частцы Варшавы, якую палякі называюць «Старэ място», варта пабываць. Як вядома, Варшава была ледзь не ўшчэнт разбурана падчас бамбардзіровак у Вялікую Айчынную. Але мудрыя нашы суседзі не без дапамогі Савецкага Саюза па крупіначках, па цаглінах узнавілі сваю даўніну і цяпер гэтым вельмі ганарацца. Радуюцца самі і прымаюць шматлікіх турыстаў. У Старым горадзе прыемна пахадзіць уздоўж даўніх муроў, адчуць пад нагамі бruкаванку, якой больш за стагоддзе. Тут прапануюць выпіць кавы, пакажуць процьму сувеніраў, запросяць на бясплатны арганны канцэрт у касцёле.

А тое, што ты ўжо перасек граніцу Германіі, можна пазнаць па дзясятках, а можа, і сотнях ветракоў. Устаноўкі, што качаюць энергію ветру, стаяць на многія кіламетры ўздоўж аўтабана, які вядзе на Захад. Можа, таму Германія і аб'явіла аб адмове ад атамнай энергетыкі, што так актыўна асвойвае новыя альтэрнатыўныя крыніцы атрымання энергіі. У Германіі наогул усё грунтоўна, акуратна, прадумана. Калі дарога ідзе каля населенага пункта, то яна абнесена высокімі агароджамі, якія забяспечваюць надзейную гукаізаляцыю.

Палі там вельмі дагледжаныя, усё абгароджана. У Еўропе, як і ў нас, у сярэдзіне жніўня былі скошаны збожжавыя, але сцяной стаяла кукуруза. Дзе-нідзе ў цюках ляжала салома, а магутныя трактары аралі зямлю пад будучы ўраджай. У гарадах жыццё ідзе сваёй чаргой. У вочы кідаліся цішыня і спакой. І хоць мы прыехалі ў Берлін у той самы час, калі ўсе СМІ наперабой перадавалі пра масавыя падпалы машын, нідзе не было відно паліцэйскіх, нішто не паказвала на нейкія асаблівыя меры бяспекі. У іх наогул ажыццяўленне бяспекі выглядае сімвалічным.

*(Заканчэнне будзе.)*

Акцыя

# У ПАМЯЦЬ АБ ПАМЕРЛЫХ НА ДАРОГАХ

**У Гродне ўпершыню прайшоў Дзень памяці дзяцей, якія загінулі на дарогах вобласці. За апошнія пяць гадоў такая доля спасцігла 52 дзяцей, у тым ліку сёлета — дваіх дзяцей, жыццё аднаго з якіх абарвалася на 25-м дні жыцця.**

У Гродне мерапрыемства, аб пачатку якога суботняй раніцай паведамілі званы хрысціянскіх храмаў, прайшло на вуліцы Горкага. На ўчастку ад кальцавой развязкі бульвара Ленінскага камсамола да скрыжавання з вуліцай Даватара апранутыя ў святлоадбівальныя камізэлькі павышанай бачнасці навучэнцы школ № 12 і 33 утварылі жывы калідор. Стоячы на дзвюх палосах вуліцы, адны трымалі плакаты з прозвішчамі, імёнамі, узростам і датамі гібелі, другія — запаленыя лампадкі чырвонага, жоўтага і зялёнага колераў. На машыны павязваліся стужачкі з сімвалізуючым святлафор трыкалорам. Святары асвячалі транспартныя сродкі, маліліся за памерлых і тых, хто жыве. У канцы акцыі дзеці запусцілі ў неба белыя паветраныя шарыкі, якія сімвалізавалі душы загінулых у ДТЗ. Ва ўсіх каталіцкіх і праваслаўных храмах горада ў той дзень па іх адслужылі паніхіды.






Першае падобнае мерапрыемства ў 2009 годзе ў Лідзе 3 верасня арганізавалі супрацоўнікі мясцовага аддзялення ДАІ. Тая акцыя стала беспрэцэдэнтным спосабам звярнуць увагу вялікай колькасці людзей на бяспеку дзяцей, не дапусціць іх гібелі і траўмавання на дарогах. Мяркуючы па тым, што на гэты раз у многіх, хто праязджаў і праходзіў па вуліцы Горкага, на вачах навярнуліся слёзы. Убачанае таксама ўразіла суграмадзян, сярод якіх было нямала жыхароў іншых рэгіёнаў Беларусі.

**Алег ДУК,**
**старшы інспектар УДАІ УУС Гродзенскага аблвыканкама.**

Дарожны патруль

# УВАГА, ДЗЕЦІ!

**«Паводле апошніх звестак, у ДТЗ у краіне загінулі 23 дзіцяці і 384 атрымалі траўмы рознай ступені цяжкасці. Як паказаў аналіз, у 90% дарожна-транспартных здарэнняў вінаватыя дарослыя. У палове з гэтых выпадкаў пацярпелымі з'яўляюцца дзеці-пасажыры», — праінфармаваў старшы інспектар УДАІ Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь Станіслаў САЛАВЕЙ.**

З 25 жніўня па 10 верасня па ўсёй рэспубліцы Дзяржаўтаінспекцыяй і супрацоўнікамі міліцыі праводзіцца комплекснае мерапрыемства «Увага, дзеці!». Прычына — цяжкая адаптацыя да горада дзяцей, якія вярнуліся з летніх канікул. Менавіта ў гэты час назіраецца павелічэнне ДТЗ з удзелам маленькіх пешаходаў. Падчас мерапрыемства праводзяцца гутаркі супрацоўнікаў міліцыі са школьнікамі, настаўнікамі, студэнтамі. «Наша мэта — каб кожнае дзіця пачула міліцыянера, супрацоўніка ДАІ, каб бацькі і настаўнікі звярнулі ўвагу на гэтую праблему, і ўвогуле ўсе тыя, хто знаходзіцца ў асяроддзі дзяцей», — адзначыў Станіслаў Салавей. Старшы інспектар параіў першыя навучальныя дні праводзіць дзяцей да школ, акцэнтаваць іх увагу на небяспечныя ўчасткі шляху. У асноўным, гэта пешаходныя пераходы. Абавязкова трэба праверыць наяўнасць флікераў.

Акрамя таго, **старшы інспектар па асобых даручэннях УДАІ Міністэрства ўнутраных спраў Андрэй ІВАНОЎ** паведаміў, што 30 жніўня ў Бараўлянах каля дзіцячай клінічнай бальніцы быў устаноўлены святлодыёдны дарожны знак з пазначэннем пешаходнага пераходу. «Ён абсалютна аўтаномны, не патрабуе ніякіх выдаткаў і дадатковага абслугоўвання», — адзначыў старшы інспектар. Месца для ўстаноўкі знака было выбрана з меркаванняў бяспекі дзяцей, якія з бацькамі наведваюць бальніцу. Сродкі на такі знак выдзеліў Глабальны экалагічны фонд, з якім упраўленне ДАІ супрацоўнічае два гады. Кошт такога дарожнага знака ў сярэднім складае каля 30 млн рублёў. «Ёсць дамоўленасць, што мы і далей папрацуем на гэтую тэму. Фонд гатовы выдзяляць пэўныя сродкі на гэтыя экалагічныя праблемы», — паведаміў Іваноў.

Плануецца, што такі знак у хуткім часе з'явіцца на трасе Мінск—Гомель і будзе ўстаноўлены за бюджэтны кошт.

Па словах **намесніка дырэктара РНПЦ траўматалогіі і артапедыі Леаніда ЛОМАЦЯ**, у год у краіне рэгіструецца прыкладна 750 тысяч траўмаў, каля 20% — сярод дзяцей. «Адсоткаў 10 складаюць дарожныя траўмы, — адзначыў спецыяліст, — гэта даволі значная частка. Калі казаць пра дынаміку траўматызму ў краіне, то апошнія дзесяць год яго ўзровень застаецца даволі высокім. Толькі ў апошнія тры гады трохі стабілізаваўся траўматызм сярод дзяцей».

Леанід Ломаць звярнуў увагу на тое, што вялікай праблемай застаецца аказанне першай дапамогі. Так, у выпадку ДТЗ першую дапамогу звычайна аказваюць кіроўцы, пасажыры, супрацоўнікі ДАІ. Менавіта для такіх людзей, «якія па абавязку службы першымі трапляюць на месца ДТЗ», дзейнічаюць спецыялізаваныя курсы па аказанні экстранай дапамогі. Паводле статыстычных звестак, прыпыненне крывацёкаў у першыя хвіліны зніжае рызыку смерці на 30%, а своечасовая імабілізацыя пры пераломах канечнасцяў на 70% змяншае развіццё траўматычнага шоку.

**Крысціна ШАЛАМІЦКАЯ.**


**ЗАВЕРЕНО**
Департамент по ценным бумагам
Министерства финансов
Республики Беларусь
_____________ В.Г. Кулаженко
29 августа 2011 г.

ФРАНСАБАНК FRANSABANK

**УТВЕРЖДЕНО**
Протокол Наблюдательного Совета
15 августа 2011 № 19

# КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ ОБ ОТКРЫТОЙ ПРОДАЖЕ ОБЛИГАЦИЙ ПЕРВОГО ВЫПУСКА «ФРАНСАБАНК» ОАО

**1. Наименование эмитента.**
на белорусском языке:
полное – «Франсабанк» Адкрытае акцыянернае таварыства,
сокращенное – «Франсабанк» ААТ.
на русском языке:
полное – «Франсабанк» Открытое акционерное общество,
сокращенное – «Франсабанк» ОАО.

**2. Место нахождения, телефон, факс, электронный адрес (e-mail)**
Юридический и почтовый адрес: Республика Беларусь, 220012, г. Минск, пр-т Независимости, 95А.
Телефон/факс: +375 17 389 36 27; +375 17 389 36 36
Адрес в интернете: www.fransabank.by
E-mail: Office@fransabank.by

**3. Номера счетов, на которые будут зачисляться средства, поступающие при открытой продаже облигаций.**
№ 3811800000067 в «Франсабанк» ОАО, код 266, УНП 100755021 (для индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, не являющихся банками).
№ 1811800000030 в «Франсабанк» ОАО, код 266, УНП 100755021 (для банков).

**4. Наименование периодического печатного издания, в котором публикуется бухгалтерская отчетность.**
Годовая бухгалтерская отчетность эмитента публикуется в газете «Звязда» не позднее 25 апреля года, следующего за отчетным, также с данной информацией можно ознакомиться на сайте «Франсабанк»ОАО по адресу: www.fransabank.by

**5. Наименование депозитария, обслуживающего эмитента, его местонахождение, дата, номер государственной регистрации и наименование органа, его зарегистрировавшего, номер специального разрешения (лицензии) на осуществление профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам, срок действия лицензии.**
«Франсабанк» ОАО обслуживает депозитарий «Франсабанк» ОАО, расположенный по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, пр-т Независимости, 95А, действующий на основании специального разрешения (лицензии) на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам № 02200/5200-1246-1078, выданного Министерством Финансов Республики Беларусь, срок действия – до 29 июля 2012 года.

**6. Размер уставного фонда.**
Сумма зарегистрированного уставного фонда эмитента составляет 67 785 220 432 (Шестьдесят семь миллиардов семьсот восемьдесят пять миллионов двести двадцать тысяч четыреста тридцать два) белорусских рублей
Уставный фонд разделен на 26 856 268 (Двадцать шесть миллионов восемьсот пятьдесят шесть тысяч двести шестьдесят восемь) простых именных акций (регистрационный номер 5-200-01-15280 от 20.01.2009 г.). Номинальная стоимость одной акции – 2 524 (Две тысячи пятьсот двадцать четыре) белорусских рубля.
Все выпущенные акции полностью оплачены и размещены среди акционеров.

**7. Дата, номер государственной регистрации и наименование органа, его зарегистрировавшего.**
Эмитент зарегистрирован Национальным банком Республики Беларусь как АКБ «Золотой талер» 05 октября 1994 года, регистрационный номер № 50, переименован в ОАО Банк «Золотой талер» 23 июня 1999 года, переименован в «Франсабанк» ОАО 13 ноября 2008 г.
Деятельность эмитента регулируется Уставом, зарегистрированным Национальным банком Республики Беларусь 05 октября 1994 года под номером 50.

**8. Место, время и способ ознакомления с проспектом эмиссии.**
Ознакомиться с подробной информацией о выпуске облигаций можно, начиная с даты публикации, в средствах массовой информации текста краткой информации об открытой продаже облигаций по адресу:
- головной офис «Франсабанк» ОАО: г. Минск, пр-т. Независимости, 95А; Управление корпоративных клиентов: г. Минск, ул. Кальварийская, 4; Управление по Брестской области «Франсабанк» ОАО: г. Брест, ул. Суворова, 105/2; ЦБУ № 1 в г. Брест «Франсабанк» ОАО: г. Брест, ул. Советская, 46; Управление по Гродненской области «Франсабанк» ОАО: г. Гродно, ул. Доминиканская, 10; ЦБУ № 1 в г. Лида «Франсабанк» ОАО: г. Лида, ул. Советская, 10; Управление по Гомельской области «Франсабанк» ОАО: г. Гомель, ул. Крестьянская, 22 и г. Гомель, ул. Красноармейская, 5а, с 9.00 до 16.00 в рабочие дни (в пятницу и предпраздничные дни с 9.00 до 15.00) .
- на интернет-сайте эмитента: www.fransabank.by.

**9. Дата принятия решения о выпуске облигаций, номер протокола и наименование органа, принявшего это решение.**
Решение о выпуске облигаций утверждено Наблюдательным Советом «Франсабанк»ОАО «04»августа 2011 года, протокол № 17.

**10. Форма выпуска облигаций, объем эмиссии, количество облигаций.**
К открытой продаже предлагаются 20 000 (Двадцать тысяч) именных процентных неконвертируемых облигаций в бездокументарной форме (в виде записей на счетах).
Серия «ФБ1», номера «000001-020000».
Объем эмиссии составляет 20 000 000 000 (Двадцать миллиардов) белорусских рублей.

**11. Номинальная стоимость облигаций.**
1 000 000 (Один миллион) белорусских рублей.

**12. Цель выпуска облигаций.**
Облигации выпускаются с целью привлечения свободных денежных средств юридических лиц и индивидуальных предпринимателей для формирования ресурсной базы банка.

**13. Сведения об обеспечении исполнения обязательств по облигациям.**
Облигации выпускаются без обеспечения в соответствии с подпунктом 1.8. пункта 1 Указа Президента Республики Беларусь от 28 апреля 2006 года № 277 «О некоторых вопросах регулирования рынка ценных бумаг».
Общий размер обязательств по выпускаемым облигациям не превышает 80 процентов нормативного капитала Эмитента, рассчитанного в соответствии с законодательством Республики Беларусь. По состоянию на 01.07. 2011 г. нормативный капитал эмитента составлял 149 270,7 млн. белорусских рублей.

**14. Сведения о согласовании выпуска облигаций с Национальным банком Республики Беларусь.**
Облигации выпускаются без обеспечения, в соответствии с подпунктом 1.8 пункта 1 Указа Президента Республики Беларусь № 277 от 28 апреля 2006 года «О некоторых вопросах регулирования рынка ценных бумаг» по согласованию с Национальным банком Республики Беларусь. Выпуск облигаций Эмитента согласован с Национальным банком Республики Беларусь, дата и номер согласования: 16.08.2011 № 330

**15. Период проведения открытой продажи облигаций.**
Дата начала продажи: 12 сентября 2011 года.
Дата прекращения продажи: 12 декабря 2011 года.

**16. Место и время проведения открытой продажи облигаций.**
Открытая продажа (размещение) осуществляется:
- на внебиржевом рынке по адресам:
Головной офис «Франсабанк» ОАО: г. Минск, пр-т Независимости, 95А; Управление корпоративных клиентов: г. Минск, ул. Кальварийская, 4; Управление по Брестской области «Франсабанк» ОАО: г. Брест, ул. Суворова, 105/2; ЦБУ № 1 в г. Брест «Франсабанк» ОАО: г. Брест, ул. Советская, 46; Управление по Гродненской области «Франсабанк» ОАО: г. Гродно, ул. Доминиканская, 10; ЦБУ № 1 в г. Лида «Франсабанк» ОАО: г. Лида, ул. Советская, 10; Управление по Гомельской области «Франсабанк» ОАО: г. Гомель, ул. Крестьянская, 22 и г. Гомель, ул. Красноармейская, 5а, с 9.00 до 16.00 в рабочие дни (в пятницу и предпраздничные дни с 9.00 до 15.00) на основании договора первичного размещения облигаций;
- на биржевом рынке в торговой системе ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» в соответствии с регламентом торгов.
Продажа облигаций осуществляется по цене, равной текущей стоимости облигаций на день продажи.

**17. Срок обращения облигаций.**
с 12 сентября 2011 года по 12 сентября 2012 года (366 дней).
Для расчета срока обращения облигаций день начала размещения и день погашения облигаций считаются одним днем.

**18. Условия и порядок досрочного выкупа.**
Эмитент обязуется произвести досрочный выкуп облигаций у их владельцев по текущей стоимости 12.12.2011 г., 12.03.2012 г., 12.06.2012 г. Для продажи облигаций эмитенту владельцы облигаций подают заявление о намерении осуществить такую продажу. Заявление передается по факсу (с последующим предоставлением оригинала) не позднее семи календарных дней до даты выкупа облигаций эмитентом по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, 95А, тел./факс +375 (17)389 36 27; +375 (17) 389 36 36
Заявление должно содержать:
- наименование владельца облигаций;
- номер и дату регистрации ценной бумаги;
- количество облигаций, предложенных для продажи;
- юридический адрес, банковские реквизиты и контактные телефоны заявителя;
- наименование профессионального участника ценных бумаг, который будет осуществлять продажу облигаций в ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» (в случае продажи облигаций на биржевом рынке).
Заявление должно быть подписано уполномоченным лицом владельца облигаций и скреплено печатью.
Эмитент имеет право выкупать облигации по договорной цене в течение всего срока обращения. Выкуп облигаций осуществляется эмитентом на внебиржевом рынке с заключением договора купли-продажи и/или на биржевом рынке в порядке, установленном ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа».
Эмитент имеет право:
- продавать на вторичном рынке выкупленные ранее облигации по договорным ценам;
- досрочно погасить выкупленные облигации;
- совершать иные операции с облигациями, предусмотренные законодательством Республики Беларусь.

**19. Дата начала погашения и порядок погашения облигаций. Дата формирования реестра владельцев облигаций.**
Дата погашения облигаций – 12.09.2012 г.
Погашение облигаций осуществляется по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, 95А в «Франсабанк» ОАО с 9.00 до 16.00 в рабочие дни (в пятницу и предпраздничные дни с 9.00 до 15.00), начиная с 12 сентября 2012 года.
При погашении облигаций владельцам облигаций выплачивается их номинальная стоимость, а также процентный доход за последний период начисления процентного дохода (иные неполученные процентные доходы – при их наличии).
Погашение облигаций осуществляется в отношении лиц, указанных в реестре владельцев облигаций, сформированном депозитарием эмитента за 5 рабочих дней до наступления срока погашения облигаций. Владельцы облигаций обязаны прекратить все сделки с облигациями за 5 рабочих дней до наступления срока погашения облигаций.
В случае если день погашения выпадает на нерабочий день, погашение осуществляется в первый рабочий день, следующий за нерабочим днем, по цене, равной номинальной стоимости облигации. Проценты на сумму погашения за указанные нерабочие дни не начисляются и не выплачиваются.
